

НАЧАЛЬНІК АВІЯЦЫІ — ПРА ЛЮБОЎ ДА НЕБА І СЯМ'Ю 4

КАГО СУДЗІЛІ НА ВАЕННЫМ ТРЫБУНАЛЕ Ў ГРЭСКУ? 5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 ЛЮТАГА 2022 г. СЕРАДА № 36 (29658)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Мінулы год, нягледзячы на ўсе складанасці для эканомікі, атрымаўся пазітыўным. ВУП краіны прырос на 2,3 %. Мы не пайшлі ў лакдаўн, не спынялі вытворчасці. Гэта дапамагло нам зрабіць экспарт каля 150 % і атрымаць рэкорднае для нас знешнегандлёвае сальда, у першую чаргу за кошт прамысловасці і паслуг. Мы выйшлі з тых эканамічных тэндэнцый, якія склаліся пасля выбараў 2020 года, калі была пэўная турбулентнасць на валютным рынку і рынку дэпазітаў. Павярнулі назад гэтыя працэсы. Курс заставаўся стабільным увесь гэты час. Адток дэпазітаў з банкаў спыніўся. Цяпер назіраецца адваротная тэндэнцыя: людзі зноў панеслі грошы ў банк. Гэта найлепшы паказчык таго, што ёсць давер да эканамічнай палітыкі, якая праводзіцца ў краіне».*

# Гонар Айчыне служыць

***Паважаныя воіны і ветэраны Узброеных Сіл!***
***Дарагія суайчыннікі!***

*Віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь — святам, якое стала сімвалам пераемнасці гераізму і подзвігу воінаў многіх пакаленняў.*

*У гэты дзень мы ўспамінаем і дзякуем афіцэрам і салдатам Вялікай Айчыннай вайны, якія са зброяй у руках абаранялі родную зямлю, аддаём даніну павагі ветэранам Узброеных Сіл і воінам-афганцам, якія з гонарам і годнасцю выканалі свой воінскі і інтэрнацыянальны абавязак.*

*Сёння слаўныя ратныя традыцыі працягвае кожны, хто ў наш неспакойны час па закліку сэрца выбірае высакародную прафесію служыць Айчыне, кожны, хто гатовы стаць на абарону міру і незалежнасці Беларусі. Вы — прыклад сапраўднага патрыятызму, смеласці і доблесці.*

*Перакананы, што Узброеныя Сілы і ў далейшым застануцца надзейным гарантам міру, суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці нашай дзяржавы.*

*Жадаю ўсім моцнага здароўя, дабрабыту і новых здзяйсненняў на карысць роднай Беларусі!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Максім і Раман РЭКЕШЫ родам з вёскі Велямічы Столінскага раёна. Пасля школы вучыліся ў Пінскім агратэхнічным каледжы, які абодва скончылі з чырвонымі дыпломамі. Паля вучобы (а яны сталі майстрамі меліярацыі) аднаго з братоў размеркавалі ў Беразіно, другога — у Смілавічы. Папрацавалі толькі месяц і — прызыў у армію. У Столінскім райваенкамаце братам-блізнятам вызначылі месца службы — рота ганаровай варты. Хлопцы, якім у жніўні споўніцца 21 год, служаць у роце ўжо дзевяць месяцаў.

***З чаго складаюцца будні гэтай самай вядомай роты, можна пачытаць на 6-й старонцы, а пабачыць — на старонцы 13-й, у традыцыйным фотапраекце.***

КОРАТКА

- **Стыпендыі Прэзідэнта Беларусь на 2022 год назначаны 70 аспірантам.**
- ЦВК акрэдытавала 160 міжнародных назіральнікаў для работы на рэферэндуме.
- **У Беларусі ў 2022 годзе ўвядуць 22 энергакрыніцы на мясцовых ПЭР.**
- Музей гісторыі БелМАПА адкрыўся ў Мінску. Экспазіцыі прысвечаны гісторыі акадэміі з 1931 года да цяперашняга часу.
- **Тры беларуская заказнікі можна наведаць анлайн дзякуючы праекту ПРААН па развіцці экатурызму.**

ISSN 1990 — 763X

22036>

9 771990 763008

Рэферэндум

# ПАЧАЛОСЯ ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ

**Яно працягнецца да 26 лютага ўключна.**
**Асноўны дзень галасавання — у нядзелю, 27 лютага**

**Па словах старшыні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ігара КАРПЕНКІ, папярэднія вынікі рэферэндуму па Канстытуцыі будуць вядомыя ўжо ў ноч на 28 лютага. «Ва ўсялякім выпадку, колькі выбаршчыкаў прыняло ўдзел у галасаванні, колькі прагаласавала «за» і колькі «супраць». Вынікі рэферэндуму падвядзём пасля атрымання пратаколаў абласных і Мінскай гарадской камісій», — адзначыў кіраўнік Цэнтрвыбаркама.**

У краіне дзейнічае 5510 участкаў для галасавання. Акрамя таго, створаны 153 тэрытарыяльныя камісіі: абласныя, Мінская гарадская, раённыя, гарадскія (у абласных цэнтрах), раённыя ў гарадах. З кожнай камісіяй можна звязацца, удакладніць, ці ўнесены грамадзянін у спіс.

Галасаванне будзе арганізавана і ў аддаленых населеных пунктах. «Камісіі будуць ездзіць па вёсках і сёлах, — заўважыў Ігар Карпенка. — Я размаўляў з камісіямі па Мінскай вобласці, у іх нават прадугледжана, што ў некаторыя вёскі будзе прыязджаць спецыяльны транспарт — аўтобус. І людзей падвязуць туды, дзе размешчаны ўчастак для галасавання. Не выключана і тое, што камісія можа праехаць з урнай па хатах непасрэдна ў гэтых далёкіх вёсках».

Для работы на рэферэндуме акрэдытавана 160 міжнародных, а таксама звыш 44 тысяч нацыянальных назіральнікаў.

СТАР. 3



Фота БелТА.

**Жыхарка Магілёва Алена ІНЧАНКА з сынам Арцёмам прыйшла на ўчастак у першы дзень датэрміновага галасавання.**

# «Пераемнасць патрыятызму і духоўнай сілы беларускага народа»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел ва ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл — гэта свята мужнасці і патрыятызму, якое аб'ядноўвае людзей розных пакаленняў: прафесійных вайскоўцаў і ўсіх, хто разумее каштоўнасць міру.**

Беларускі лідар звярнуў увагу, што ў мерапрыемстве ўдзельнічаюць тыя, хто ў суровыя гады Вялікай Айчыннай ваяваў за будучыню, хто пранёс праз усё жыццё боль страт родных, блізкіх, баявых таварышаў. «Нізкі паклон і бязмежная падзяка вам, дарагія ветэраны. Вы — сімвал непераможнасці беларускага народа! Дай Бог вам здароўя», — сказаў ён.

Прэзідэнт прывітаў ветэранаў-афганцаў, а таксама ветэранаў Узброеных Сіл і дзеючых афіцэраў арміі. «Вы, мусіць, у гэты год, асабліва сёння, адчулі, як патрэбны нам. Мы выказваем падзяку тым, хто насіў пагоны ваеннага і застаўся сёння ў страі і дапамагае беларускаму народу вызначыцца. Менавіта вы ціха і спакойна сталі бар'ерам на шляху збеглых, якія бясчынствуюць, спрабуюць нам падкінуць у краіну чарговы мяцеж», — звярнуўся да іх Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што толькі сапраўдныя мужчыны, выключна смелыя і адважныя, выбіраюць у наш неспакойны час прафесію Радзіму бараніць: «Вы ўвасабляеце пераемнасць патрыятызму і духоўнай сілы беларускага народа», — сказаў ён.

### «МЫ АГРЭСАРАМІ НЕ БЫЛІ І НЕ БУДЗЕМ»

Паводле слоў беларускага лідара, сёння, жывучы пад бясхмарным небам, на жаль, мы не можам сябе адчуваць у поўнай бяспецы. Па словах кіраўніка дзяржавы, усё, што адбываецца ў свеце, — пытанне вечнага канфлікту цывілізацый, ідэалогій, культур, у які ўсходнеславянскія народы ніколі не былі агрэсарамі. «І запомніце: мы агрэсарамі ніколі не будзем. Абараняючы сябе, мы ратавалі і іншыя краіны, чые лідары сёння сарамліва аб гэтым замоўчваюць. Але не гэта важна. ***Галоўнае, каб рэваншысты на Захадзе памяталі, што братэрства і непераможнасць савецкага народа не сышлі ў гісторыю з развалам вялікай краіны. Любыя спробы запалохвання і навязвання нам чужой волі будуць праваленыя.*** Я гэта кажу тым, хто сёння спраўна служыць заакіянскім куратарам, нарошчваючы замежную ваенную прысутнасць па перыметры нашых граніц. Перш за ўсё — заходнім суседзям», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, польскія і балтыйскія палітычныя эліты ўзялі курс на беспрэцэдэнтную мілітарызацыю дзяржавы і павелічэнне вайсковых рэсурсаў.

### «НАДЫШОЎ ЧАС САПРАЎДНЫХ МУЖЫКОЎ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў народзе існуе пытанне: будзе вайна ці не. На што ён адказаў, што вайна супраць нас ужо ідзе. Гібрыдная вайна — гэта сучасная вайна: бліцкрыг, ціск праз СМІ, а затым эканамічная вайна, якая выяўляецца праз санкцыі. «Празмерныя санкцыі — гэта ўдушэнне любой дзяржавы і народа. Яны могуць паставіць любыя дзяржавы на мяжу гарачай вайны. Так што гэта вайна ідзе. Проста ***сучасны перыяд настолькі складаны і супярэчлівы, і дай бог, каб ён нас зберог ад памылак, каб мы ні ў якім разе не дапусцілі няслушных рашэнняў і няслушных крокаў***», — адзначыў Прэзідэнт.

Па яго словах, народ мае права спытаць у Прэзідэнта, як быць беларусам у гэтай складанай сітуацыі. Даваць парад Аляксандр Лукашэнка не стаў, а проста папрасіў. Папрасіў займацца кожнага сваёй справай: хадзіць на працу, адпачываць пасля яе, гадаваць дзяцей — чым больш, тым лепш. «***Надышоў час сапраўдных мужыкоў, нас***. І не дай бог, але, калі давядзецца, мы павінны прадэманстраваць свайму народу, што нас нездарма кармілі некалькі дзесяцігоддзяў. Што тут новага? Нічога. ***Запомніце: улады і я як Прэзідэнт будзем рабіць усё, каб Беларусь была мірным астраўком на гэтай звар'яцелай планеце***», — запэўніў беларускі лідар.

### «НАШ ШЛЯХ — ШЛЯХ МІРАЛЮБНАСЦІ»

У гэты востры перыяд Прэзідэнт Беларусі звярнуўся да ўкраінскага народа і кіраўніцтва, калі яны не перайшлі чырвоную рысу. Ён прапанаваў зрабіць так, каб славяне заўсёды жылі ў міры і згодзе.

«Усё праходзіць, не толькі супрацьстаянні, канфлікты, але і самыя страшныя войны — усё праходзіць, забываецца. Праблема ў тым, наколькі глыбокі шнар будзе ў сэрцах нашых славянскіх народаў пасля нашых канфліктаў. Яшчэ раз прапаную: спыніцеся, адмахніцеся ад гэтых заакіянскіх гаспадароў, ніякага шчасця яны вам не прынясуць. Як толькі вы станеце ім непатрэбныя, яны вас выкінуць на сметніцу гісторыі. Гэта наш шлях — шлях міралюбнасці і згоды», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Тым, хто точыць штыкі на захадзе, ён сказаў, што беларусы ніколі не былі здраднікамі і не будуць. «І як плануеце расстраляць расіян у спіну праз Беларусь, у вас нічога не атрымаецца. Яшчэ раз паўтараю: ***трэба супакоіцца, узяць галаву ў рукі і прыняць правільнае рашэнне ў інтарэсах народаў. Народы, якія загінуць, калі, крый божа, пачнецца вайна, не жадаюць гэтай вайны. Яны не жадаюць гінуць, яны жадаюць жыць, як усе. Вось наша непарушная пазіцыя. Я яе адкрыта вам выкладаю. Яшчэ раз хачу падкрэсліць: ніякай панікі, ніякага вар'яцтва, як жылі мы, так і будзем жыць***», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

### «БЕЛАРУСКАЯ АРМІЯ МАБІЛЬНАЯ І КАМПАКТНАЯ»

Паводле слоў Прэзідэнта, на гэтым фоне кааліцыйны Захад зладзіў маштабную інфармацыйную кампанію па падрыхтоўцы грамадскай думкі да непазбежнасці вайны ў рэгіёне. Але ён папярэдзіў тых, хто марыць аб непазбежнасці гарачага канфлікту, што яны больш ніколі не застануць беларусаў знянацку. «Пасля апошняга трагічнага ўрока з сярэдзіны мінулага стагоддзя мы бесперапынна ўмацоўвалі свой абаронны патэнцыял. ***Сёння сучасная беларуская армія мабільная, кампактная і забяспечаная самымі сучаснымі ўзорамі ўзбраення і ваеннай тэхнікі***», — канстатаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што ваеннаслужачыя ўдасканальваюць сваю баявую вывучку, асвойваючы новыя метады і спосабы адбіцця пагроз, у тым ліку і ва ўзаемадзеянні з іншымі сілавымі ведамствамі. Паслядоўна выбудоўваецца сістэма тэрытарыяльнай абароны, якая гарантуе ўсенародны характар абароны Айчыны. У Беларусі актыўна развіваецца абаронны сектар эканомікі, які аб'ядноўвае самыя высокатэхналагічныя вытворчасці, уключаючы ракетную. Сёння ствараюцца сучасныя сродкі сувязі і аўтаматызацыі, беспілотная авіяцыя, стралковая зброя і боепрыпасы, іншая прадукцыя беларускага ВПК. Акрамя таго, на працягу найбліжэйшых некалькіх гадоў плануецца закупка і пастаўка ў войскі шырокага пераліку самых сучасных узбраенняў. Актыўна развіваецца ўзаемадзеянне з саюзнікамі па АДКБ. Аператыўнае выкарыстанне калектыўных міратворчых сіл для стабілізацыі абстаноўкі ў Казахстане паказала высокі патэнцыял Арганізацыі як ключавога фактару забеспячэння еўразійскай прасторы.

Ён адзначыў, што краіны АДКБ і ў далейшым гатовы забяспечваць сваю ваенную бяспеку ўсімі сіламі і сродкамі, якія ёсць у іх распараджэнні. Будзе далей узмацняцца развіццё ваеннага супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй, накіраванае на павышэнне абараназдольнасці Саюзнай дзяржавы.

### «МЫ АБАРАНЯЛІ НАШУ ПАМЯЦЬ І БУДЗЕМ ЯЕ АБАРАНЯЦЬ»

«Беларусь ніколі нікому не пагражала і ніколі не стане крыніцай пагроз для іншых народаў. Але права прытрымлівацца спрадвечных традыцый і абранага народам палітычнага курсу непарушна. Мы баранілі яго і будзем бараніць. І не толькі са зброяй у руках», — сказаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што сёння ў катэгорыю «ваенная бяспека» закладваюцца такія паняцці, як абарона гістарычнай праўды, гістарычнай памяці і выхаванне патрыятызму. «Мы абаранялі нашую памяць і будзем мы яе абараняць, ва ўмовах рэзкай эскалацыі глабальнай напружанасці. Беларусы павінны памятаць, што мы з'яўляемся нашчадкамі народа-пераможцы. І трэба прыкласці ўсе намаганні для захавання беларускай дзяржаўнасці. Упершыню ў гісторыі мы з вамі пабудавалі незалежную і суверэнную дзяржаву. І наш абавязак перад тымі, хто плаціў жыццём за гэтае дасягненне, — захаваць гэтую дзяржаву. Але не для нас, а для дзяцей! Ім жыць у гэтай дзяржаве», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Віншуючы прысутных з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнт пажадаў, каб сімвалізм гэтага нацыянальнага свята даваў веру ў сябе, натхняў на новыя здзяйсненні ў імя роднай краіны.

Падчас урачыстага сходу Прэзідэнт уручыў дзяржаўныя ўзнагароды ўдзельнікам міратворчай місіі АДКБ у Казахстане.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Падводзім вынікі

# ЭКААСЯРОДДЗЕ ДЛЯ ТАЛЕНТАЎ

## Фінал праекта «100 ідэй для Беларусі» прайшоў у Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень»

**На перамогу ў заключным туры рэспубліканскага маладзёжнага праекта прэтэндавалі 120 аўтарскіх распрацовак у дзесяці намінацыях у дзвюх узроставых катэгорыях. А ўсяго ў 2021 годзе ў аргкамітэт праекта паступіла 1,1 тысячы заявак, адбылося 66 адборачных тураў.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

— Новае пакаленне маладых вучоных прыходзіць сёння не толькі ў беларускую навуку, але і ў кіраванне дзяржавай, становіцца на чале грамадскіх арганізацый, — падкрэсліў у сваім выступленні падчас урачыстага адкрыцця фіналу **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар СЕРГЕЕНКА**. — Конкурс «100 ідэй для Беларусі» праводзіцца ўжо адзінаццаты раз. За гэты час у ім прыняло ўдзел больш як 18 тысяч адораных хлопцаў і дзяўчат. Усяго за няпоўныя 11 гадоў існавання конкурсу яго скарбонку папоўнілі тысячы ідэй і адкрыццяў. Дарэчы, кожны пяты праект за ўвесь перыяд правядзення конкурсу быў рэалізаваны на практыцы ці ў вытворчасці.

Ігар Сергеенка адзначыў, што праект «100 ідэй для Беларусі — адзін з самых дзейсных інструментаў па выяўленні таленавітай моладзі. Ён вядомы далёка за межамі краіны. Многія дзяржавы пераймаюць і развіваюць наш пазітыўны вопыт. Што асабліва важна — сама моладзь становіцца на чале канвеера па пошуку і развіцці адораных рабят. Першыя пераможцы праекта ўжо многага дабіліся ў жыцці, сталі кіраўнікамі ў навуковай і педагагічнай сферах. І цяпер ужо іх выхаванцы прымаюць удзел у розных этапах конкурсу. Ва ўсім свеце прарыў інавацый і навукі — за моладдзю. Сённяшні ўдзельнік конкурсу — перш за ўсё чалавек разважлівы, які развіваецца, з дапытлівым розумам. «Вядома ж, гэта сапраўдны патрыёт, які сваімі прапановамі жадае ўнесці ўклад у сацыяльна-эканамічнае, грамадска-палітычнае развіццё нашай краіны і ўмацаванне падмурка незалежнай дзяржавы — роднай Беларусі. Я рады, што ў многіх гэта актыўна атрымліваецца. Упэўнены, што эфектыўнасць конкурсу «100 ідэй для Беларусі» як сацыяльнага ліфта, які прасоўвае ўчарашняга школьніка, студэнта, аспіранта да вяршыняў навукі, будзе толькі расці. За вамі цягнецца ўся астатняя моладзь краіны».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што з кожным годам Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі імкнецца палепшыць якасць рэалізацыі конкурсу. На рэйкі пастаўлена работа па папулярызацыі «100 ідэй для Беларусі», пошуку партнёраў, спонсараў, зацікаўленых дзяржаўных і іншых арганізацый. Пляцоўка стала своеасаблівым экаасяроддзем з уласнай атмасферай, якая ўключае майстар-класы, трэнінгі, вэбінары, платформы, медыяпадтрымку.

У гэтым годзе арганізатары прапанавалі фіналістам і гасцям мерапрыемства маштабныя інтэрактыўныя пляцоўкі. Сярод іх — адкрыты дыялог «Сіла Асноўнага Закона». У ходзе дыскусіі маладыя распрацоўшчыкі змаглі напрамую задаць кіраўніцтву краіны пытанні, якія іх цікавяць, з улікам таго, што, згодна з артыкулам 51 праекта Канстытуцыі, дзяржава будзе садзейнічаць укараненню інавацый.

Яшчэ адзін госць фіналу — **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** — звярнуў увагу на колькасць сярод удзельнікаў школьнікаў, якая пастаянна расце: « У іх ёсць вялікая цікавасць і самае галоўнае — узровень ведаў, што дае магчымасць увасабляць ідэі ў сур'ёзныя праекты. Мы нацэлены на тое, каб у краіне была паўнавартасная сістэма, якая дае магчымасць выявіць таленавітую моладзь: ад сельскай мясцовасці да сталічных ВНУ. Акрамя таго, важна, каб за імі замацоўваліся педагогі, якія дапамогуць вывесці іх веды і навыкі на яшчэ больш высокі ўзровень. Не ўсе ўдзельнікі стануць пераможцамі, але мы павінны падтрымаць кожнага і даць пуцёўку ў жыццё».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СТАГОДДЗЕ ГЕНЕТЫКІ

**Дзякуючы навуковым прарывам у свеце біятэхналогій за апошняе дзесяцігоддзе яны па інвестыцыйнай прыцягальнасці даганяюць ІТ-індустрыю. Менавіта біятэхналогіі адкрылі безліч новых магчымасцяў у сельскай гаспадарцы, экалогіі і прыродаахоўнай дзейнасці, харчовай прамысловасці і медыцыне. Калі раней, каб вывесці новы сорт, патрабаваліся дзесяцігоддзі, то сучасныя метады дазваляюць значна паскорыць селекцыю і паменшыць выдаткі на яе. У артыкуле 51 Канстытуцыі, якая выносіцца на рэферэндум, гаворыцца, што дзяржава садзейнічае развіццю культуры, навуковых і тэхнічных даследаванняў на карысць агульных інтарэсаў. У новай рэдакцыі дакумента ў пералік дабаўлена таксама фармулёўка «садзейнічае ўкараненню інавацый».**
**Інстытут генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі з'яўляецца вядучым навукова-даследчым цэнтрам краіны ў галіне генетыкі, геномікі і біятэхналогій. Пра дасягненні ў гэтых галінах і перспектыўныя напрамкі для даследаванняў мы гутарым з намеснікам дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Аленай ГУЗЕНКАЙ.**



## Актуальнасць даследаванняў

***— Алена Віталеўна, па выніках работы інстытута за мінулы год вашы вучоныя сабралі ўсе магчымыя ўзнагароды. Па-першае, распрацоўкі даследчыкаў трапілі ў ТОП-10 вынікаў НАН за мінулы год. Па-другое, калектыў вучоных інстытута атрымаў прэмію Нацыянальнай акадэміі навук. А ваш малады вучоны стаў уладальнікам іменной прэміі імя акадэміка Купрэвіча. Не маглі б вы расказаць, у чым заключалася актуальнасць адзначаных на найвышэйшым узроўні навуковых распрацовак?***

— Візіткай Інстытута генетыкі з'яўляецца распрацоўка і ўкараненне сучасных ДНК-тэхналогій для генетычнай пашпартызацыі чалавека, раслін і жывёлін. Прэміяй Нацыянальнай акадэміі навук у галіне біялагічных навук быў адзначаны цыкл работ па распрацоўцы і ўкараненні метадаў ДНК-ідэнтыфікацыі жывёл з мэтай пацвярджэння іх відавой прыналежнасці і павышэння прадукцыйных якасцяў. У нас у краіне дзейнічае Закон «Аб племянной жывёлагадоўлі», згодна з якім кожная племянная жывёліна павінна мець генетычны пашпарт. Задача па распрацоўцы гэтых дакументаў была ўскладзена на наш інстытут. Мы пастаянна ўдзельнічаем у генетычным тэсціраванні племянных жывёл, якія завозяцца ў краіну. І без генетычнага пашпарта ні адна з іх не можа быць уключана ў селекцыйны працэс, таму што калі жывёліна не будзе адпавядаць пэўным параметрам, то пацерпіць увесь маладняк і гэта будуць вельмі сур'ёзныя матэрыяльныя страты. Менавіта ДНК-тэсціраванне дазваляе амаль са стапрацэнтнай верагоднасцю сказаць, ці здаровая тая ці іншая жывёліна і да якой пароды яна належыць.

Таксама мы вельмі шчыльна супрацоўнічаем з Інстытутам рыбнай гаспадаркі НАН. Для павышэння вытворчасці таварнай рыбы ў практыку рыбаводства калегамі актыўна ўкараняюцца распрацаваныя намі геномныя тэхналогіі. Яны дазваляюць, напрыклад, аддзяліць чыстапародных вытворцаў ад іх гібрыдаў, прысутнасць якіх у маткавых статках непажаданая, бо змяншаецца аб'ём лоўлі таварнай рыбы. Распрацавана таксама ДНК-тэхналогія вызначэння відаў ласасёвых у складзе рыбнай прадукцыі, што дапамагае выяўляць фальсіфікаваную прадукцыю.

Прэміяй імя акадэміка Васіля Купрэвіча была адзначана работа нашага маладога вучонага, кандыдата біялагічных навук Ганны Яцкіў, якая займаецца вывучэннем генетычнай асновы ювенільнага ідыяпатычнага артрыту ў дзяцей. Некаторыя формы гэтага захворвання вылучаюцца высокай рызыкай ранняй інвалідызацыі, і поспех тэрапіі шмат у чым залежыць ад своечасова распачатага лячэння, што магчыма толькі пры ўмове ранняй дыягностыкі. Выяўленне спецыфічных ДНК-маркераў — важны крок пры пастаноўцы дыягназу ў складаных клінічных выпадках, што мае не толькі навуковае, але і сацыяльнае значэнне, паколькі дазваляе павысіць якасць жыцця пацыентаў.

А ў ТОП-10 вынікаў дзейнасці вучоных НАН Беларусі ў галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў трапіла яшчэ адна медыцынская тэма — нашы вучоныя вызначылі спектр патагенных мутацый у генах, звязаных з парушэннямі рытму і праводнасці міякарда ў пацыентаў з высокай рызыкай раптоўнай смерці. Быў распрацаваны метад вызначэння верагоднасці развіцця парушэнняў сардэчнага рытму. Інструкцыя па яго прымяненні зацверджана ў Міністэрстве аховы здароўя, укаранёна ў РНПЦ «Кардыялогія» і знаходзіцца ў працэсе ўкаранення ў РНПЦ «Маці і дзіця». Верагоднасць перадаць сваім дзецям патагенную мутацыю, а з ёй і захворванне, вельмі вялікая. На жаль, першая і адзіная праява падобных захворванняў — раптоўнае спыненне сэрца і смерць. Прадухіліць гэта можна з дапамогай медыкаментознага лячэння. Яно падбіраецца індывідуальна ў залежнасці ад мутацыі.

## «Бібліятэка» генетычных першакрыніц

***— Рэспубліканскі банк ДНК, створаны на базе інстытута, быў прызнаны нацыянальным набыткам. Якімі аб'ёмамі генетычнай інфармацыі ён цяпер валодае і як гэта выкарыстоўваецца?***

— У нашым банку захоўваюцца ДНК чалавека, жывёл, раслін і мікраарганізмаў — усяго каля 18 тысяч узораў. Для прыкладу: там утрымліваюцца каштоўныя ўзоры ДНК еўрапейскага зубра, ДНК рыб, коней, калекцыя ўзораў ДНК несапраўдных трансфармантаў ільну-даўгунцу, якая не мае аналагаў у свеце. Таксама ў банку захоўваюцца ўзоры ДНК пацыентаў са злаякаснымі і дабраякаснымі пухлінамі розных органаў, з бранхіяльнай астмай, астэапарозам, тугавухасцю і іншымі захворваннямі. Ёсць узоры ДНК карэнных жыхароў Беларусі з шасці этнаграфічных рэгіёнаў краіны, ДНК спартсменаў нацыянальных каманд, штамы мікраарганізмаў, якія выкарыстоўваюцца ў вытворчасці ферментаваных малочных прадуктаў, а таксама біяўгнаеннняў і біястымулятараў росту раслін.

У банку ёсць калекцыя ўзораў ДНК для працягласці захоўвання, унікальныя ўзоры, якія мы нікому і ніколі выдаваць не будзем, напрыклад, генетычны матэрыял рэдкіх раслін, унесеных у Чырвоную кнігу, а ёсць узоры, якія могуць выкарыстоўвацца ў навуковых мэтах і для абмену з навуковымі ўстановамі іншых краін.

Напрыклад, банк ДНК чалавека дазваляе спецыялістам вывучаць фундаментальныя праблемы генетыкі чалавека, улічваць індывідуальныя генетычныя асаблівасці спартсменаў у ходзе трэніровак для дасягнення імі высокіх спартыўных вынікаў, захоўваючы здароўе, вывучаць індывідуальную адчувальнасць да лекавых прэпаратаў, а таксама садзейнічаць вырашэнню пытанняў у галіне крыміналістыкі.

Па сутнасці, сабраныя калекцыі ўяўляюць сабой аналаг бібліятэкі сістэматызаваных генетычных першакрыніц (на кожны новы ўзор складаецца пашпарт), да якіх навукоўцы змогуць звярнуцца ў любы момант. Магчыма, у будучыні, калі малекулярная генетыка зробіць гіганцкі рывок наперад, усе гэтыя ўзоры стануць унікальным матэрыялам для даследчыкаў... Не выключана, што навукоўцам давядзецца аднаўляць расліны, якія сёння знаходзяцца на мяжы знікнення.

## Фотаробат па кроплі крыві

***— Летась завяршылася выкананне навукова-тэхнічнай праграмы Саюзнай дзяржавы «ДНК-ідэнтыфікацыя». Наколькі паспяховай яна аказалася і ці будзе працяг?***

— Вельмі спадзяёмся на працяг. У Беларусі ўжо ўсе падтрымалі канцэпцыю праграмы «ДНК-ідэнтыфікацыя-2», цяпер трэба атрымаць падтрымку расійскага боку. Першая праграма была скіравана пераважна на крыміналістыку. У нашым інстытуце былі распрацаваны ДНК тэхналогіі, скіраваныя на ідэнтыфікацыю асобы, распрацаваны методыкі, у прыватнасці, па ўстанаўленні знешнасці чалавека па ДНК (колеру яго вачэй і валасоў) з даволі высокай дакладнасцю — каля 90 працэнтаў і вышэй. Напрыклад, пры знаходжанні на месцы забойства крыві ці сліны невядомага злачынца, якога няма ў базе даных, крыміналісты могуць скласці яго партрэт. Ёсць поспехі і ў галіне ідэнтыфікацыі ўзросту: мы цяпер вызначаем узрост чалавека па біялагічных слядах з дакладнасцю да трох гадоў. Важны аспект для складання партрэта — псіхаэмацыянальныя асаблівасці чалавека, а яны таксама залежаць ад генаў. Ёсць таксама ўчасткі ДНК, якія адказваюць за схільнасць да агрэсіі.

Далей нам бы хацелася засяродзіць увагу на нечалавечых ДНК. Шэраг злачынстваў звязаны з фальсіфікацыяй мяса, рыбы (калі танныя гатункі выдаюцца за дарагія), ікры, несанкцыянаванай высечкай лесу. Гэта таксама праблемы генетыкі. Па пылку расліны можна ўстанавіць рэгіён яе паходжання. Акрамя таго, плануем вывучаць на генетычным узроўні наркатычную сыравіну, вызначаць, у якой краіне і мясцовасці яна была вырашчана.

## У пошуках цёмнай лясной пчалы

***— А якія яшчэ цікавыя навуковыя праекты рэалізуюцца сёння беларускімі генетыкамі?***

— Мы прыступілі да вывучэння абарыгенных жывёл. Спрабуем знайсці і захаваць абарыгенную пароду коней. Занятыя зараз і пошукам цёмнай лясной пчалы. Высветлілася, што знайсці яе на тэрыторыі Беларусі вельмі складана — мы ўстанавілі толькі некалькі кропак на поўдні нашай краіны і ў Віцебскай вобласці. На Міншчыне яе дакладна няма — мы праводзілі шырокі маніторынг. Справа ў тым, што пасля вайны ў Беларусь завозілі пчол з Украіны і Каўказа. І ў нас цяпер сустракаюцца адны міксы. У савецкія часы дзейнічалі дзяржаўныя пчаліныя гадавальнікі, якія займаліся развядзеннем пчаламаток. Цяпер засталіся літаральна два-тры такія гадавальнікі, а ўсё астатняе — гэта прыватны сектар. Што яны прывозяць у Беларусь, што разводзяць? Гэта вялікае пытанне. Ва ўсім свеце ў апошнія гады зафіксавана такая з'ява, як калапс пчаліных сем'яў, калі пчаляводы адкрываюць вуллі, а там пуста. Чаму так адбываецца, ніхто не ведае. Сельская гаспадарка ў ЗША і Расіі вельмі моцна пацярпела ад гэтай з'явы, таму што ад апыляльнікаў залежыць прадукцыйнасць нашых садоў і шэрагу гароднінных культур. Мы лічым, што трэба разводзіць менавіта цёмную лясную пчалу, таму што яна адаптаваная да нашых умоў — усё ж такі пчолы ў нашых кліматычных умовах вымушаны па паўгода жыць у вуллях, дзе яны павінны захаваць сваё здароўе і сілы да новага сезона, а гібрыдныя пчолы часцей хварэюць, яны менш прадукцыйныя і паступова выраджаюцца. Пчаляводы пра гэта не ведаюць і кожны сезон закупляюць новую пчаламатку. У навуковай літаратуры звесткі пра вывучэнне генетыкі пчол, якія разводзяцца на пчальніках у Беларусі, практычна адсутнічаюць, а пра тое, што на нашай тэрыторыі магчыма сустрэць цёмную лясную пчалу, — наогул даных няма. Беларусь пакуль — белая пляма на картах. Будзем выпраўляць гэту сітуацыю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**
*Поўны тэкст чытайце на сайце zviazda.by.*

# ПАЧАЛОСЯ ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Лічбы яшчэ не канчатковыя. «Гэта СНД, ШАС, некалькі прадстаўнікоў ад АДКБ, — удакладніў старшыня Цэнтрвыбаркама. — Ёсць палітыкі, дэпутаты, грамадскія дзеячы з шэрагу краін як індывідуальныя эксперты. Яны не прадстаўляюць пэўныя місіі або арганізацыі, а выступаюць выключна як самастойныя эксперты».

Як падкрэсліў Ігар Карпенка, рэферэндум — вельмі сур'ёзная грамадска-палітычная падзея, на якую ідуць яшчэ і пэўныя сродкі. Паводле яго слоў, згодна з каштарысам, на арганізацыю і правядзенне рэферэндуму будзе патрачана каля 20 мільёнаў беларускіх рублёў.

— Я ўсё ж такі рэкамендаваў бы нашым грамадзянам праявіць грамадзянскую актыўнасць, прыйсці на ўчасткі для галасавання і выказаць сваё меркаванне адносна таго пытання, якое задаў Прэзідэнт у сваім указе. У гэтым, напэўна, сутнасць праяўлення сваёй грамадзянскасці, — акцэнтаваў увагу старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

А тым часам на базе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі адкрыўся грамадскі інфармацыйны цэнтр па назіранні за рэферэндумам. Пачынаючы з першага дня датэрміновага галасавання, тут будзе акумулявацца інфармацыя аб ходзе рэферэндуму ад больш чым 40 тысяч нацыянальных назіральнікаў. Яны ўсе прайшлі неабходнае навучанне, таму поўнасцю кампетэнтныя ў пытанні арганізацыі работы камісій па рэферэндуме.

— Датэрміновае галасаванне — вельмі зручны фармат для людзей, — заўважыў **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА**. — На сёння па той інфармацыі, якая ёсць у нас, пэўных праблемных пытанняў няма, і парушэнняў, якія маглі б паўплываць на ход рэферэндуму, не выяўлена. У людзей ёсць магчымасць свабодна прыйсці і свабодна прагаласаваць.

**Вераніка КАНЮТА.**

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

# НАЙВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ ПАЛКОЎНІКА ЛУК'ЯНОВІЧА

## Начальнік ваеннай авіяцыі — пра найлепшую прафесію, «жалезных» птушак і сям'ю

**Андрэй ЛУК'ЯНОВІЧ — чалавек ва Узброеных Сілах вядомы. Ваенны лётчык-снайпер, у нядаўнім мінулым камандзір (на працягу дзесяці гадоў ён узначальваў 50-ю змешаную авіяцыйную базу). Гэта той чалавек, які адзін з нямногіх у нашай краіне выконвае надзвычай важныя паветраныя місіі: перадыслакацыю ваеннай тэхнікі і ўзбраення, дастаўку вакцыны з Кітая... А падчас парадаў на Дзень Незалежнасці або Дзень Перамогі за вышэйшым пілатажам палкоўніка Лук'яновіча сочыць уся Беларусь — вялікі самалёт Іл-76, якім ён кіруе, заўсёды замыкае паветраны эшалон і салютуе гасцям урачыстасці.**



Нядаўна Андрэй Лук'яновіч указам Прэзідэнта прызначаны намеснікам камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны — начальнікам авіяцыі. Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл вопытны лётчык і военачальнік расказаў «Звяздзе» не толькі пра тое, што ён кожны раз адчувае, калі падымаецца ў неба. Пагаварылі мы з гэтым унікальным чалавекам і пра зямное.

### Лятаць марыў з дзяцінства

А, між іншым, нарадзіўся будучы начальнік авіяцыі ў звычайнай сям'і, у невялікім гарадку на Гродзеншчыне — Смаргоні. Бацька пайшоў з жыцця, калі ён быў у першым класе. Уся адказнасць за траіх дзяцей (у Андрэя Лук'яновіча ёсць дзве сястры) лягла на кволыя матчыны плечы.

— Гэта надзвычайная жанчына, самы выдатны чалавек у маім жыцці, — кажа пра маці Андрэй Юльянавіч. — Яна выхоўвала нас у атмасферы любові і клопату. Мама, Ніна Рыгораўна, увесь час жыла для нас, працавала не складаючы рук. Жылі вельмі сціпла, як усе. Сучасныя дзеці жывуць у дастатку, для нас жа любы, нават самы просты матулін падарунак, быў за шчасце. За гэты час у нас з'явіліся традыцыі: падчас свят збіраемся вялікай сям'ёй у мамы. Аднак ковід унёс свае карэктывы: цяпер гэта не так часта атрымліваецца — маму беражом.

Кожныя летнія канікулы Андрэй Лук'яновіч праводзіў у бабулі на хутары. Дзеці там не толькі адпачывалі, а яшчэ працавалі (у бабулі была вялікая гаспадарка). Менавіта там, на хутары, ён упершыню ўбачыў самалёты.

— Трасы побач праходзілі, самалёты часта ляталі, — успамінае палкоўнік. — У небе след, звышгук — ажно шкло ў хаце дрыжала! Тады і з'явілася жаданне стаць лётчыкам. Праўда, усё гэта здавалася нязбытнай марай. Аднак я верыў, што калі-небудзь і мне ўдасца ўзняцца ў неба. Лятаць, як і жыць, без вялікай мэты бессэнсоўна.

### Самалёт без недахопаў

Свой самы галоўны мацярынскі подзвіг Ніна Рыгораўна Лук'яновіч здзейсніла, калі адпусціла свайго адзінага сына, які вымушаны быў рана пасталець, вучыцца. Андрэй Лук'яновіч паступіў у Балашоўскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў. Конкурс у знакамітую кузню кадраў ваеннатранспартнай авіяцыі быў высокі. «Вучыўся ў школе добра, цвёрды харашыст, — так характарызуе сябе палкоўнік. — Любіў дакладныя навукі. Матэматыка, фізіка — мой канёк».

Аднак, каб стаць лётчыкам, мала добра вучыцца. Трэба мець яшчэ і выдатнае здароўе. І яно не падвяло! Паступалі разам са школьным сябрам. Атрымалася толькі ў Лук'яновіча. Калі ён стаў курсантам, у парыве радасці адправіў дахаты вялікую тэлеграму са словамі падзякі маме, што паступіў. Гэта была найважнейшая падзея ў жыцці лётчыка.

Не менш важная — і першы палёт. Андрэй Лук'яновіч дагэтуль яго памятае. Гэта было на другім курсе вучылішча, на чэшскім самалёце Л-410. Эмоцый столькі, што пасля палёту ў будучага начальніка авіяцыі выдалася бяссонная ноч.

— Я добра памятаю сваіх настаўнікаў: як школьных, так і па вучылішчы, — гаворыць Андрэй Лук'яновіч. — Лётчык-канструктар Андрэй Сямёнаў — выдатны чалавек, які мяне ўсяму навучыў, даў пуцёўку ў жыццё. Потым мне таксама шанцавала на камандзіраў. Мне ўвогуле ў жыцці шанцуе: заўсёды атачаюць добрыя людзі.

Чатыры гады ў вучылішчы праляцелі імгненна. Лятаў і Андрэй Лук'яновіч. Падчас кожнага палёту ўсё больш захапляўся сваёй прафесіяй, небам, дзе быў ужо частым госцем.

Размеркаванне выпала акурат на перыяд распаду Савецкага Саюза. Малады афіцэр трапіў у горад Улан-Удэ, у 150-ы ваенна-транспартны авіяцыйны полк. Менавіта там пачаў лятаць на самалёце Ан-12, які лічыцца адным з самых складаных у навучанні і пілатаванні. «Пасля палётаў ад празмерных фізічных нагрузак лётчыкі заўсёды выходзілі з самалёта змакрэлымі: камбінезон хоць адціскай, — заўважае палкоўнік. — Тыя, хто засвоіў Ан-12, можа кіраваць любым самалётам».

І сам начальнік авіяцыі — гэтаму прыклад. Акрамя Л-410 і Ан-12, ён асвоіў такія тыпы самалётаў, як Ан-26 і Іл-76. На апошнім лятае і цяпер. Гэта як верны сябар, якому нельга здрадзіць. І надзейны: па шматфункцыянальнасці Іл-76 пакуль не пераўзышоў ніхто. «Канструктар Генрых Наважылаў стварыў самалёт без недахопаў, — перакананы ваенны лётчык-снайпер. — Гэта ўнікальны самалёт, які не мае ў сваім класе аналагаў і альтэрнатывы. Ён патрабуе ведання камп'ютарнай тэхнікі і праграмавання, лятае ў любых кліматычных умовах і можа выканаць любую задачу».

У беларускую армію Андрэй Юльянавіч прыйшоў ужо першакласным камандзірам. У 50-й змешанай авіяцыйнай базе, што ў Мачулішчах пад Мінскам, удасканальваў прафесійнае майстэрства, а разам з тым праходзіў усе пасады: камандзір атрада, намеснік камандзіра эскадрыллі, камандзір эскадрыллі, намеснік камандзіра авіяцыйнай базы, яе камандзір.

### Дынастыя Лук'яновічаў

Увесь гэты час Андрэй Лук'яновіч меў надзейны тыл. Яго жонка, Святлана Віктараўна, таксама родам са Смаргоні. «Мне яшчэ бабуля казала: дзвюх Радзім не бывае», — успамінае лётчык. — Гэта азначала, што жонку трэба браць з Беларусі».

Бабуліны словы назаўсёды ўрэзаліся ў памяць унука. Хоць па-іншаму, напэўна, і не магло быць: Святлана адразу запала яму ў сэрца. Як сапраўдная жонка афіцэра, яна паехала з ім ва Улан-Удэ і ўсюды, дзе б ён не быў, ствараў хатні ачаг. Андрэй Юльянавіч прызнаецца, што жонка вельмі падобная на яго маці. У іх таксама трое дзяцей.

Старэйшы, Яўген, — гонар сям'і. Ён пайшоў па слядах бацькі. Прычым рашэнне, што дынастыі лётчыкаў Лук'яновічаў быць, прымаў не галава сям'і. Жэня рос побач з аэрадромам, часта бываў у воінскіх часцях, дзе Андрэй Юльянавіч служыў. Вядома, яшчэ маленькім хлопчыкам яму было дазволена дакрануцца да святыні святых — да штурвала самалёта. Таму натуральна, што ён з самага дзяцінства, як некалі яго бацька, марыў лятаць. Праўда, пайшоў у грамадзянскую авіяцыю. Адвучыўся, быў адабраны ў адну з вядучых расійскіх авіякампаній, лятае на самым вялікім самалёце — Boeing 747. За месяц здзяйсняе гадавы налёт ваеннага лётчыка. Дарэчы, і сынава жонка — таксама пілот грамадзянскай авіяцыі. У начальніка авіяцыі падрастае ўнучка.



Андрэй ЛУК'ЯНОВІЧ з сынам Яўгенам.

— Самае галоўнае ў жыцці — гэта сям'я: спачатку тая, у якой расцём, потым — якую ствараем самі, — перакананы Андрэй Лук'яновіч. — Мне вельмі падабаецца выказванне: пакуль жывыя нашы бацькі, мы адчуваем сябе дзецьмі. І гэта, паверце, дарагога каштуе. Калі мы адчуваем клопат, калі ёсць, да каго звярнуцца па параду: хто, як не бацькі, блізкія людзі, можа падказаць, як правільна паступіць у той ці іншай сітуацыі?

Яшчэ ў Андрэя Лук'яновіча — дарослая дачка, сын-школьнік. Настасся вучыцца ў Германіі. Калі прыйшоў час паступаць, выдатніца адразу прайшла ў тры ВНУ, потым даводзілася выбіраць. Мікіта вучыцца ў дзявятым класе. Як і бацька, схільны да дакладных навук. Таксама цікавіцца самалётамі, аднак стаць лётчыкам не дазволіць здароўе.

### Уладары часу

Пытаюся ў Андрэя Юльянавіча, як жонка перажывае яго палёты, ці прывыкла за гэтыя гады, што ў небе муж праводзіць больш часу, чым на зямлі. «Яна ведае, што гэта самы небяспечны від транспарту, — кажа ваенны лётчык-снайпер. — Гэта як на аўтамабілі, не складаней».

Вядома, жартуе. «У мяне найлепшая прафесія, — ужо сур'ёзна кажа Андрэй Лук'яновіч. — Яна мае два бакі: інтэлектуальны і эмацыянальны. Той эмацыянальны зарад, які атрымлівае лётчык, знаходзячыся ў небе, страціўшы кантакт з зямлёй, нельга ні з чым параўнаць. Калі адрываешся ад зямлі, адчуваеш сябе шчаслівым. Асабліва ў пахмурнае надвор'е. Узляцеў, прабіваеш аблокі, а там — сонца свеціць. Прычым заўсёды. І ты адразу расплываешся ва ўсмешцы, згадваючы тое шэрае надвор'е, якое было на зямлі. Калі перасякаеш некалькі часавых паясоў, ноч цягнецца ўсяго нейкія тры гадзіны, здаецца, што сонца стаіць на месцы і ты яго даганяеш. Адным словам, лётчыкі — уладары часу. Беларускія лётчыкі — патрыёты, прафесіяналы сваёй справы, якія лятаюць усюды і ў любых умовах».

Начальнік авіяцыі пацвярджае гэта канкрэтнымі прыкладамі, пералічвае шматлікія ўзнагароды, якія беларускія лётчыкі на працягу многіх гадоў прывозяць з Армейскіх міжнародных гульняў. «У нас створана цудоўная беларуская лётная школа, якая існуе з 1999 года, — заўважае Андрэй Лук'яновіч. — Нягледзячы на тое, што яна маладая, той вопыт савецкіх інструктараў мы не страцілі. Нашы лётчыкі навучаюцца ў Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. Афіцэры, якіх мы выпускаем, даслужваюцца да камандзіраў авіяцыйных баз, лётчыкаў-інспектараў у камандаванні. Акрамя таго, рыхтуем лётчыкаў-снайпераў, якія гатовы лятаць заўсёды і ўсюды, у розных метэаўмовах выканаць любую задачу».

— Мы маем самую сучасную тэхніку, — адзначае намеснік камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны. — На ўзбраенні стаяць новыя верталёты Мі-8МТ, новыя самалёты Су-30СМ. Ідзе мадэрнізацыя авіяцыйнай тэхнікі. Заключаны кантракты на новую авіяцыйную тэхніку — верталёты Мі-35М і яшчэ адну эскадрыллю самалётаў Су-30СМ.

...Пра самалёты Андрэй Лук'яновіч гатовы гаварыць бясконца. І не толькі гаварыць — без неба ён ужо сябе не ўяўляе. За плячыма палкоўніка — звыш 4200 гадзін налёту. У рабочым кабінеце — сапраўдны музей мадэляў самалётаў: міні-копіі тых «жалезных» птушак, на якіх лятаў сам. Неба — яго стыхія: менавіта над аблокамі ён адчувае сябе самым шчаслівым, бо жыве ў самай прыгожай краіне (паверце, адтуль лепш відаць), імя якой — Беларусь.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з асабістага архіва Андрэя ЛУК'ЯНОВІЧА.**

Год гістарычнай памяці

# ТРАГЕДЫЯ ПЕРАХОДАЎ

## Паліцэйскія, якія 79 гадоў таму спалілі вёску на Случчыне, былі асуджаны ваенным трыбуналам

**На досвітку 23 лютага 1943 года жыхары гэтай слуцкай вёскі займаліся штодзённымі справамі. Жанчыны завіхаліся каля печы. Мужчыны, у асноўным хворыя і старыя, таксама былі пры хаце. Дзеці спалі. А тыя, хто прачнуўся, сядзеў на цёплай печы або даядаў свой сціплы сняданак.**

Акупанты ўварваліся ў Пераходы нечакана. Мала хто бачыў, як яны акружылі вёску. А тыя, хто і бачыў, шанцаў на выратаванне ўжо не меў. Па перыметры вёскі было выстаўлена ачапленне. Выйсці было немагчыма. Зайсці — можна. Назад ужо не выпускалі...

### Расстрэльвалі ва ўласных хатах

Перш-наперш немцы загадалі паліцэйскім сабраць у хатах людское дабро, забраць скаціну. Загнаць кароў, коней і іншую жывёлу ў Слуцк даручылі хлопцам і дзяўчатам, якіх папярэдне адабралі. Пасля прыбыцця ў райцэнтр іх чакаў медагляд. Здаровых планавалі адправіць на прымусовыя работы ў Германію. Іх бацькі, іншыя сваякі прадчувалі гэта, таму выйшлі развітацца.

Тых, хто пайшоў праводзіць сваіх дзяцей, акупанты сагналі ў адну з хат, якая належала сям'і Жураўскіх. Колькі там было людзей, ніхто не лічыў. Чалавек 60 — не менш. Сагнаўшы ў хату, забілі вокны, дзверы, падпалілі. На вуліцы паставілі двух кулямётчыкаў: у тых, хто выбівае вокны ці дзверы, было загадана страляць.

Пакуль памагатыя акупантаў назіралі за тым, як у агні гараць іх землякі, эсэсаўцы заходзілі ў астатнія хаты і шукалі, хто там застаўся. Гэта былі людзі, чыіх родных не забралі для адпраўкі ў Германію. Іх расстрэльвалі ва ўласных хатах. Дзяцей — на вачах бацькоў, бацькоў — пад галашэнне дзяцей... У той лютаўскі дзень у Пераходах было забіта 116 чалавек (да вайны ў вёсцы пражывала 131 жыхар). Ахвярамі агню і гітлераўскай кулі сталі 70 дарослых і 46 дзяцей. Самаму малодшаму было два тыдні, старэйшаму — за 90 гадоў. Акрамя адабранай моладзі, якая пагнала скаціну ў Слуцк, выжыць удалося шасцярым...

— Сцепаніда Дардынская не загінула толькі цудам, — расказвае **навуковы супрацоўнік Слуцкага краязнаўчага музея Васіль ЦІШКЕВІЧ.** — Немцы расстралялі ўсю яе сям'ю: мужа і шасцярых дзяцей. Сама гаспадыня была толькі паранена. Па аповедах жыхароў вёскі Шантароўшчына, куды яна потым прыйшла, Сцепаніда Дардынская адной рукой прытуліла да сябе дзіця, якому было каля года. Яно было мёртвае. У другой руцэ жанчына трымала суседа, якое, відаць, да таго, як у хату ўвайшлі немцы, давала дзіцяці, каб яно не плакала. Куля трапіла ў маленькага чалавека, якога ў момант расправы маці трымала на руках... Людзі казалі: Дардынская яшчэ доўга не магла ачомацца ад гора. Пасля вайны яна выйшла замуж за чалавека, які таксама страціў усю сваю сям'ю. У іх нарадзілася дзіця.



Слуцкія краязнаўцы Уладзімір БОЙКА і Васіль ЦІШКЕВІЧ клапоцяцца аб захаванні памяці сваіх землякоў.

### «Бяжы, сынок!»

Яшчэ адным жыхаром вёскі Пераходы, якому ўдалося выжыць, быў Іван Ліневіч. Бацькі баяліся, што яго, як і іншых сынавых аднагодкаў, могуць угнаць у Германію. Доўга не думаючы, схавалі Ваню на печы, накрылі коўдрай. Перад ім на край пасадзілі пяцярых сястрычак.

З апошнім сведкам той жудаснай трагедыі, які дажываў свой век у Карэліі, трымаў сувязь Васіль Цішкевіч. Вось што ён расказваў слуцкаму краязнаўцу, калі ўспамінаў самы страшны дзень у сваім жыцці: «Мама вазілася ля печы, бацька ў нервовым чаканні прысеў на ложак. У хату зайшлі тры карнікі і, не гаворачы ні слова, адкрылі агонь з аўтаматаў. Адна з сясцёр, мёртвая, упала на мяне. Я быў паранены ў левую нагу. Калі страляніна спынілася і карнікі выйшлі, прыпадняўся і агледзеўся. У жывых быў толькі бацька. Цяжка паранены, ён папрасіў падняць яго ногі на ложак. Тата блаславіў мяне і загадаў: «Бяжы, сынок!»

Ужо пачаў гарэць дах. Іван схапіў коўдру і паўзком дабраўся да капца, дзе захоўвалі бульбу. Ён сядзеў там і бачыў, як гарэла яго хата, а таксама самыя родныя для яго людзі. У адзін момант 15-гадовы падлетак застаўся круглым сіратой...

«Колькі знаходзіўся ў сваім сховішчы, не ведаю, — пісаў у сваіх успамінах, якія былі надрукаваны ў кнізе Тацціяны Падаляк «Нашчадкі вогненных вёсак», Іван Ліневіч. — Апомніўся, калі ўбачыў суседскую дзяўчыну. (Немцаў ужо не было.) Яна дастала аднекуль панчоху, і я перавязаў параненую нагу. Пайшлі па вёсцы ў пошуках жывых. За 20 метраў ад нашага спаленага дома, прыхіліўшыся да плота, стаяў паранены ў руку і спіну мой стрыечны брат Мікалай. Мы яго адвялі ў яму, дзе захоўвалі сена, прыкрытае дошкамі і зямлёй. Усяго жывых набралася шэсць чалавек. Начавалі ў лесе ў яме з сенам, а на наступны дзень хавалі нябожчыкаў».

Можна толькі ўявіць (праўда, наўрад ці атрымаецца), што адчуваў 15-гадовы хлопец, калі закапваў у зямлю самых дарагіх людзей — бацькоў і пяцярых сястрычак... Івана Ліневіча прытулілі бацькавы родзічы. Хлопец рваўся ў партызаны. У атрад не ўзялі: малы ды яшчэ з раненнем. Скончылася вайна. Вёска не адрадзілася. Не было каму. І для каго — жыхароў Пераходаў засталося ўсяго пару чалавек.

Па першым часе Іван Ліневіч жыў на Случчыне. Яго прызначылі брыгадзірам калгаса. Затым была армія, пасля якой служыў афіцэрам, стварыў сям'ю. Лёс закінуў Івана Арсенцьевіча ў карэльскі гарадок Аланец. Аднак удалечыні ад Радзімы яго думкі заўсёды былі аб Беларусі, родных Пераходах. З хваляваннем і радасцю ён успрыняў навіну аб тым, што цудам з таго пекла пашчасціла выбрацца і яго аднакласніку Фёдару Жураўскаму, у хаце якога была спалена большасць аднавяскоўцаў. Той жыў у Калініградзе. Дзякуючы Васілю Цішкевічу адбылася тэлефонная размова аднавяскоўцаў, якія на працягу многіх гадоў не ведалі аб існаванні адзін аднаго.

### Ваенны трыбунал у Грэску

У той лютаўскі дзень акупанты знішчылі не толькі Пераходы. Дзевяць вёсак Палікараўскага сельскага Савета фашысцкія каты ператварылі ў папялішчы, многія з іх назаўсёды зніклі з геаграфічнай карты Беларусі. 23 лютага 1943 года толькі на Случчыне ў агні, а таксама ад кулі загінула больш за 1300 чалавек — мірных грамадзян, маленькіх беларусаў, жыццё якіх толькі пачалося...

За гэтыя жудасныя злачынствы супраць мірных жыхароў адказвалі не толькі немцы. Самая чорная работа была ўскладзена на карны атрад «Яхтцуг», у склад якога ўваходзілі паліцэйскія. У жніўні 1960 года іх судзілі падчас ваеннага трыбунала ў Грэску.

Суд ішоў пяць дзён. На ім прысутнічалі 60 сведак. Сотні людзей прыходзілі ў залу кінатэатра, дзе засядаў ваенны трыбунал, каб паслухаць, што адбываецца на працэсе, паглядзець у вочы гэтым нелюдзям, якія былі вінаватыя ў смерці іх блізкіх. Ахвотных прысутнічаць на працэсе было так шмат, што яны не ўмяшчаліся ў залу. Для іх на вуліцы паставілі гучнагаварыцель.

На лаве падсудных сядзелі Сцяпан Ілясаў, Канстанцін Елішэвіч, Іван Цябус і Пётр Бурак. Гэта на іх руках была кроў жыхароў Пераходаў, а таксама суседніх вёсак. Камандзірам карнага атрада, які аддаваў злачынныя загады, быў Сцяпан Ілясаў, ураджэнец Архангельскай вобласці. Будучы чырвонаармейцам, трапіў у нямецкі палон. Уцёк. Адсядзеўся крыху ў добрай жанчыны, якая дала яму прытулак, і пайшоў прасіцца ў паліцыю, абяцаючы верна служыць фашысцкай Германіі. Кандыдатуру маладога чалавека не адобрылі — мауляў, нічым сябе не праявіў. Тады Ілясаў нічога лепшага не прыдумаў, як выдаў былых ваеннапалонных, сваіх сяброў. Так у гестапа пачалася кар'ера здрадніка. Прайшоў падрыхтоўку ў школе паліцыі, прыняў прысягу на вернасць Гітлеру. Вярнуўшыся камандзірам, узначаліў карны атрад «Яхтцуг», створаны немцамі для барацьбы з партызанамі і мірнымі людзьмі. У яго падначаленні было 40 карнікаў — такіх жа галаварэзаў, як і ён сам.

Канстанцін Елішэвіч уступіў у паліцыю ў 18 гадоў. Быў у атрадзе карнікаў кулямётчыкам, за асаблівыя «заслугі» насіў медаль. Пасля вайны цэлых 15 гадоў жыў спакойным жыццём у Кемераве, працаваў цырульнікам.

«Бурак таксама на лаве падсудных, — пісаў спецыяльны карэспандэнт «Мінскай праўды» П. Журба, які прысутнічаў на судовым працэсе. — Не было і сямнаццаці гадоў гэтаму выродку, калі ён стаў у рады паліцэйскіх. Быў кулямётчыкам у карным атрадзе «Яхтцуг». Закончыў школу паліцэйскіх. Прыняў там прысягу. У апошнія гады прыладзіўся ў Еркаўскім раёне Цюменскай вобласці, загадваў гаспадаркай аднаго з леспрамгасаў. Даведаліся лесарубы, што побач з імі знайшоў прытулак здраднік Радзімы, і паслалі на працэс свайго таварыша Ігната Цяльнова. Паслухай, кажуць, а потым раскажаш, хто за наш кошт адкормліваў морду. Цяльноў слухаў, запісваў».

Іван Цябус, хлопец з Пухавіччыны, які восенню 1941 года добраахвотна ўступіў у паліцыю, — адзіны з падсудных, хто не хаваўся ад пакарання, а сам прыйшоў у суд. Асабліва цяжкіх злачынстваў на яго сумленні не было. Больш за тое, некаторыя сведкі прыйшлі ў суд, каб падтрымаць падсудната. Справа ў тым, што, нягледзячы на тое, што Цябус служыў у ворага, ён са шкадаваннем ставіўся да людзей і пры любой магчымасці ім дапамагаў.

Усе з гэтых здраднікаў, акрамя Цябуса, пасля вайны сядзелі ў турме. Па амністыі неўзабаве выйшлі на волю. Калі сталі вядомыя новыя факты іх злачынстваў, зноў селі на лаву падсудных. Ілясава і Елішэвіча прыгаварылі да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу. Бураку, паколькі на момант уступлення яго ў паліцыю ён быў непаўнагадовым, прызначылі 15 гадоў пазбаўлення волі. Цябусу далі 10 гадоў зняволення, хоць пракурор прасіў значна больш. Змягчылі прыгавор сведкі, якія расказалі, што, калі палілі Палікараўку, ён выратаваў 37 чалавек.

### Мемарыял трэба рэстаўрыраваць

Менавіта пра лёс Пераходаў вядомы рэжысёр Элем Клімаў зняў фільм «Ідзі і глядзі». Аўтары кнігі Алесь Адамовіч, Янка Брыль і Уладзімір Калеснік «Я з вогненнай вёскі» ў свой час запісалі ўспаміны некаторых жыхароў, якім пашчасціла не застацца ў гэтым пекле. Споведзь яшчэ аднаго жыхара Пераходаў, а таксама гісторыі сведак іншых спаленых населеных пунктаў пад адной вокладкай сабрала Тацціяна Падаляк.

У пачатку ліпеня споўніцца 50 гадоў, як на гэтай прасецы сярод лесу, дзе некалі віравала жыццё, створана памятнае месца. У свой час эксперты разглядалі яго ў якасці аднаго з магчымых варыянтаў рэспубліканскага мемарыяльнага комплексу, які сімвалізаваў бы ўсе спаленыя вёскі Беларусі. Выбралі Хатынь. Памяць спаленай вёскі Пераходы, а таксама іншых каля 40 (па новых даных Генеральнай пракуратуры — звыш 60) населеных пунктаў Слуцкага раёна, па-варварску знішчаных немцамі і іх памагатымі, была ўвекавечана сіламі мясцовых жыхароў, якія сабралі грошы і звярнуліся да ўкраінскага мастака.

Скульптура «Жанчына ў жалобе», якая з'яўляецца эпіцэнтрам мемарыяльнага комплексу, — даніна памяці ўсім жыхарам Слуцкага краю, жыццё якіх абарвалася так рана і несправядліва. Сёння помнік мае патрэбу ў рэстаўрацыі. На плітах пайшлі расколіны, у любы момант можа абваліцца скульптура. Дзякуючы ініцыятыве мясцовай улады неабыякавыя людзі сабралі пэўную суму, але гэтага недастаткова. Далучыцца да добрай справы можа кожны (тэлефануйце ў рэдакцыю, мы падкажам, як гэта зрабіць).



Нашчадкі спаленых жыхароў вёскі Пераходы каля магілы сваіх родных.

... Сімвалічна, што ў красавіку 1944 года на месцы спаленай вёскі адбыўся бой, які ўвайшоў у гісторыю. Супраць немцаў змагаліся партызаны атрада Астроўскага брыгады Суворава і атрада Ракасоўскага брыгады Фрунзэ. Загінула каля 80 карнікаў — партызаны адпомсцілі фашыстам за бязвінна знішчаных жыхароў Пераходаў і іншых вёсак Слуцкага краю.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара і Анатоля КЛЕШЧУКА.**
*Слуцкі раён.*

# «Я ШМАТ СІЛ ПАКЛАЎ НА ТОЕ, КАБ СТАЦЬ АФІЦЭРАМ»

**Дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам. На гэта выслоўе капітан усміхаецца, але згаджаецца: такія спадзяванні ў яго ёсць. Ды і старт да генеральскіх пагонаў зроблены добры. Герой святочнага выпуску рубрыкі «Плеяда маладых» — камандзір другой роты ганаровай варты каменданцкага батальёна Мінскай ваеннай камендатуры Раман ФІЦНЕР.**



***— Раман, як служба вас прывяла ў роту ганаровай варты?***

— Калі я скончыў ліцэй у сваім родным Мазыры, вырашыў з сябрам паступіць у Ваенную акадэмію. Здаў экзамены, фізпадрыхтоўку і быў залічаны на факультэт ракетных войскаў і артылерыі і ракетна-артылерыйскага ўзбраення. На пятым курсе прадстаўнікі Мінскай ваеннай камендатуры адабралі мяне ў роту ганаровай варты, куды я размеркаваўся ў 2016 годзе. Быў камандзірам узвода, потым намеснікам камандзіра роты. У той час існавала толькі адна рота ганаровай варты ў Мінскай камендатуры. У 2018 годзе стварылі другую, і мяне назначылі на пасаду яе камандзіра. Кар'ерны рост: перайшоў на ступень вышэйшую.

## Дэвіз: «Працаваць, каб дасягаць вяршынь».

***— Цяпер у Мінскай ваеннай камендатуры дзве роты ганаровай варты — першая і другая. Вы разам тут, ва Уруччы, базіруецеся?***

— Так, першая рота размяшчаецца на адзін паверх ніжэй. Разам займаемся. Адзінае адрозненне паміж намі — мерапрыемствы, у якіх удзельнічаем.

***— За якія з іх адказвае ваша рота?***

— Сустракаем і праводзім міжнародныя дэлегацыі, суправаджаем цырымоніі з удзелам нашага Прэзідэнта і кіраўнікоў іншых дзяржаў, ускладаем вянкі і кветкі да мемарыялаў на святы, удзельнічаем у пахаваннях ганаровых дзеячаў краіны.

***— Колькі ў вас у год такіх мерапрыемстваў?***

— Вельмі шмат — сотні. За 2021 год я налічыў каля 250. І гэта толькі ў маёй роты.

***— Якія з іх вам асабліва запомніліся за часы службы?***

— Візіты замежных лідараў. Зараз з-за ковіду іх амаль няма, але раней віталі Сі Цзіньпіна, Рэджэпа Таіпа Эрдагана. На такіх сустрэчах задзейнічаны не толькі нашы дзве роты. Роты ганаровай варты ёсць у пагранічных войсках і МУС. Падчас візітаў мы працуем чатырма групамі. Шаноўнага госця сустракаем у аэрапорце, потым маршам праходзім перад лідарамі ў Палацы Незалежнасці. Таксама салдаты роты ганаровай варты размяшчаюцца каля залаў, дзе праходзяць перагаворы. Звычайна пасля такіх прыёмаў бывае ўскладанне кветак. Там таксама нашы падраздзяленні праходзяць страявым крокам.

***— Гэта самыя складаныя мерапрыемствы, у якіх вы бераце ўдзел?***

— Яшчэ Дзень Незалежнасці і Дзень Перамогі. Да такіх мерапрыемстваў мы асабліва доўга рыхтуемся.

Нашы салдаты таксама ўдзельнічаюць у міжнародных фестывалях. Летась ездзілі на «Спаскую вежу» ў Маскву. Там на працягу амаль двух тыдняў выступалі кожны дзень з плац-канцэртам. Мерапрыемства складанае, але запамінальнае.

***— Раскажыце, якія абавязкі ў камандзіра роты ганаровай варты?***

— Я праводжу заняткі з асабовым складам, тлумачу сутнасць службы, адбіраю ахвотных для паступлення ў ВНУ, маладых байцоў размяшчаю, забяспечваю маёмасцю. Усяму, што салдаты роты ганаровай варты паказваюць на мерапрыемствах ад плац-канцэртаў да ўскладання вянкоў, іх неабходна навучыць. Гэта патрабуе шмат трэніровак. Я ствараю адмысловую праграму навучання і кантралюю яе. Складаная праца і для байцоў, бо здольнасці ў іх розныя. Некаторыя прыходзяць у армію з жаданнем спакойна адбыць час. У нашай роце так не «пракаціць» — тут трэба працаваць, каб нечага дасягнуць. Кожны дзень салдаты займаюцца шэсць гадзін страявой падрыхтоўкай. Калі рыхтуемся да значных мерапрыемстваў, пакідаем для гэтага яшчэ больш часу.

## «Армія значна змяняе светапогляды на жыццё».

***— Як праходзяць заняткі? Ведаю: выкарыстоўваеце спецыяльнае абсталяванне для навучання?***

— Так, разнастайныя ўцяжарвальнікі, грузы, якія прывязваем да ног. Так байцоў трэніруем падымаць высока ногі для прыгожага кроку. У нас ёсць макеты вянкоў, звараныя з арматуры. Хлопцы іх носяць, трэніруюцца. На навучанне новых салдат сыходзіць каля шасці месяцаў. Аснова нашай роты — салдаты тэрміновай службы, таму яе склад пастаянна змяняецца. На месца дэмабілізаваных прыходзяць новыя салдаты. Частка старога складу застаецца, і больш вопытныя салдаты дапамагаюць, матывуюць маладых, каб тыя імкнуліся да іх узроўню.

***— Каб трапіць у роту ганаровай варты, неабходна прайсці свайго роду кастынг і адпавядаць пэўным параметрам: рост не ніжэйшы за 185 см, добрае здароўе, прыемная знешнасць, годная адукацыя...***

— Для адбору ствараецца група з афіцэраў і медыкаў. Падчас прызыву яны ездзяць па ваенкаматах Беларусі і набіраюць адпаведны склад па тых характарыстыках, што вы назвалі. Так, павінны быць правільныя рысы твару, першая група здароўя (але робім і паслабленні, напрыклад на зрок), славянская знешнасць. Непрымальныя шрамы на тvary, руках. Не трапіць да нас і той, хто мае на бачных месцах татуіроўкі.

***— Пра салдат роты ганаровай варты нават кажуць: яны настолькі гнуткія, што здольныя сесці на шпагат.***

— Сапраўды, хлопцы з такімі здольнасцямі ёсць. Гэта вынік працаёмкай страявой падрыхтоўкі. Адно з базавых практыкаванняў: салдат прыхінаецца да сцяны, адну нагу ставіць на падлогу, а другую цягне ўверх. Гэта трэніруе страявы крок і гнуткасць.

***— Лічыцца, што пачэсна служыць салдату ў спецназе, дэсантных войсках. Рота ганаровай варты — таксама эліта айчынных Узброеных Сіл?***

— Гэтыя віды войскаў займаюцца крыху іншым. Іх дзейнасць звязана з выключнай баявой падрыхтоўкай на палігонах, падчас вучэнняў. Мы, наадварот, ва ўсіх на вачах. У плане фізічнай і страявой падрыхтоўкі рота ганаровай варты дакладна будзе не горшай.

***— Таварыш капітан, вы імкнецеся быць прыкладам для сваіх салдат?***

— Так, я часта трэніруюся з імі. Умею рабіць усё, што і яны. Інакш, як бы я іх тады навучыў?!

***— Роце ганаровай варты хапае прызыўнікоў — прыгожых, высокіх, з выдатным здароўем? Не адчуваеце недабору?***

— Часам бывае, але гэта літаральна пару чалавек.

***— Колькі байцоў зараз служыць у роце ганаровай варты?***

— Штат маёй роты — 84 чалавекі. З гэтага складу чатыры — сяржанты кантрактнай службы. Гэтыя байцы засталіся пасля заканчэння тэрміновай ваеннай службы на працу.

***— Да салдат роты ганаровай варты асаблівае стаўленне. З-за інтэнсіўных трэніровак ім прызначана асаблівае харчаванне?***

— Дадатковае. Дзённы абед, напрыклад, складаецца з супу, гарніру і мяснай стравы двух відаў. Калі ўсім салдатам даюць 100 грамаў соку, то нашым — 250. Таксама і масла — усім па 10 грамаў, нашым — у два разы больш. З харчаваннем у іх няма праблем. Ды і прыходзяць у армію яны малымі і худымі, а дэмабілізуюцца вялікімі і прыгожымі.

***— Ёсць у былых байцоў роты ганаровай варты льготы пры паступленні?***

— Яны здаюць ЦТ, збіраюць дакументы, калі па профільных прадметах у іх у атэстаце адзнака большая за «шэсць», мы ім робім рэкамендацыйны ліст. Ён дае права без конкурсу паступіць у пэўныя ВНУ. Магчымасць яго атрымаць ёсць толькі на працягу года пасля дэмабілізацыі.

Нашы былыя салдаты вельмі запатрабаваныя як супрацоўнікі ў ваенных структурах. Многія з іх ідуць служыць пасля арміі па кантракце ў МУС, МНС. З агульнай колькасці дэмабілізаваных працуе ва Узброеных Сілах амаль палова.

***— Давайце крыху пагаворым пра самую відовішчную частку вашай працы — плац-канцэрт. У сярэднім ён цягнецца 7—10 хвілін. Колькі часу сыходзіць на яго падрыхтоўку? Хто распрацоўвае элементы?***

— Рэпетыцыі займаюць каля трох месяцаў. Калі б у гэтым годзе быў парад на 9 Мая, мы б з 23 лютага пачалі да яго рыхтавацца. Калі адпрацавалі Дзень Перамогі, пачынаем рыхтавацца да Дня Незалежнасці. У плац-канцэрце задзейнічаны самыя лепшыя салдаты, далучаюцца да нас і ваеннаслужачыя рот ганаровай варты пагранічнікаў і МУС. Зводнай ротай з чатырох груп мы выступаем на дзяржаўных святах. У праграме ёсць базавыя элементы, да іх кожны год дадаюцца новыя «фішкі». У асноўным, усе элементы прыдумваюць самыя вопытныя і рэзультатыўныя салдаты.

***— Калі назіраеш за плац-канцэртам па тэлевізары, часам бачыш, як нехта з салдат губляе фуражку ці карабін падчас выступлення. Вы неяк потым ушчуваеце гэтых байцоў?***

— Не, яны самі разумеюць свае «касякі». Чалавек не машына. Нельга ўсё зрабіць ідэальна. Байцы вельмі хвалююцца на кожным мерапрыемстве, тым больш на такіх значных.

***— Як вы ім дапамагаеце перамагаць хваляванне?***

— Размаўляю, матывую, супакойваю. Заўважаю: гэта вельмі адказнае мерапрыемства, але на ім жыццё не скончыцца.

***— Для вашых салдат спецыяльна шыюць форму (зялёную, сінюю) і боты. Навошта два камплекты?***

— Зялёная — агульнавайсковая, сіняя — войск ВПС, ССА і СПА. У асноўным працуем у зялёнай. Сінюю выкарыстоўваем на мерапрыемствах, звязаных з гэтымі родамі войскаў, і на парадзе.

***— Чаму менавіта сінюю?***

— Гэта традыцыя, сіняя форма больш прыгожая. Выбіраем гэты колер, каб адрознівацца ад рот ганаровай варты пагранічнікаў і МУС, бо ў іх форма толькі аднаго колеру — зялёнага.

***— Часта сумесная служба, асабліва ў юнацтве, звязвае людзей сяброўствам на многія гады. Вы падтрымліваеце сувязі з таварышамі па вучобе?***

— З тымі, хто застаўся служыць, кантактую.

***— А ёсць тыя, хто пакідае службу?***

— Ёсць і такія. Пасля Ваеннай акадэміі неабходна адслужыць яшчэ пяць гадоў. Той, хто стаміўся служыць ці вырашыў, што гэта не яго, пакідае Узброеныя Сілы пасля адпрацоўкі.

***— Вы калісьці шкадавалі, што выбралі ваенную справу?***

— Ніколі нават не думаў пра гэта. Немагчыма забыць 11 гадоў свайго жыцця. Я шмат сіл паклаў на тое, каб стаць афіцэрам. Армія значна змяняе погляды на жыццё. Я прыйшоў у Ваенную акадэмію хлопцам, які нічога не разумеў пра службу, а выйшаў абсалютна іншым, пасталеў.

***— Вы жанаты. Як пазнаёміліся з жонкай? Яна таксама супрацоўніца ваенных структур?***

— Не. З жонкай разам вучыліся ў ліцэі ў Мазыры. Сустракаліся з маіх курсанцкіх часоў. Мінулай восенню ажаніліся.

***— Вашы родныя ганарацца вамі?***

— Канечне, і падтрымліваюць у маёй працы.

***— Жонка разумее асаблівасці ваеннай службы?***

— У мяне працоўная пяцідзёнка, але часам бывае, што мерапрыемствы выпадаюць і на выхадныя. Яна разумее, нават не памятаю, каб нешта казала супраць.

***— Аб чым марыць камандзір роты ганаровай варты?***

— Дабіцца поспехаў у сваёй справе, вырасці ў службе.

***— Дрэнны той салдат, што не марыць стаць генералам. Марыце пра гэта?***

— Канечне, чаму не?!

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

# А Ў НАС У ХАЦЕ ГАЗ. ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ



## Што змянілася для беларусаў у карыстанні газавым абсталяваннем

**Адзіны парадак праверкі стану дымаходаў і вентыляцыйных каналаў, перазаключэнне дагавораў, устаноўка дымавых сігналізатараў, узмацненне патрабаванняў да бяспекі. Гэтыя і іншыя змены ў сферы правіл карыстання газам уступілі ў сілу ў панядзелак, 21 лютага. Як гэта адаб'ецца на спажыўцах газу і абслуговых арганізацыях, расказалі эксперты газавай галіны.**

### РАЗ НА ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ І КОЖНЫЯ ТРЫ МЕСЯЦЫ

Манапольны від дзейнасці ў газавай сферы ў Беларусі — толькі газазабеспячэнне. А вось абслугоўваць газаправоды і газавае абсталяванне могуць не толькі газавікі, але і абслуговыя арганізацыі — гэта новае паняцце, якое прапісалі ў новай рэдакцыі дакумента. Такім чынам, ім перадаецца частка функцый газавікоў, расказаў **Уладзімір РУСЬ, начальнік упраўлення сістэм газазабеспячэння «Белпаліўгаз»**.

З'явіліся ў дакуменце і іншыя новыя фармулёўкі. Раней было паняцце «сэрвісны цэнтр», спецыялісты якога абслугоўвалі газавыя катлы нароўні з газавікамі. Цяпер гэта абслуговая арганізацыя (як і іншыя), якая спецыялізуецца не толькі на газавым абсталяванні, але і на газаправодах.

### ВАРТА ВЕДАЦЬ

Газавікам перыядычна неабходна павышаць свае кампетэнцыі, бо пастаянна з'яўляюцца новыя матэрыялы і вырабы. Прынамсі, адных толькі катлоў існуе 140 марак.

Аварыйныя заяўкі выконваюцца бясплатна, а рамонтныя — за грошы.

Падчас паверкі (бясплатнай) газавых лічыльнікаў раз на дзесяць гадоў абаненту ўсталёўваюць падменную прыладу. Калі лічыльнік неабходна рамантаваць — за гэта плаціць чалавек.

Згодна з межамі падзелу балансавай прыналежнасці, падводзячы газаправод (да крана, які адключае падачу газа на дом), — зона адказнасці газазабяспечвальных арганізацый. Уводны і ўнутраны газаправоды ў шматкватэрным доме — калектыўная адказнасць і ўласнасць. Частка газаправоду ў кватэры пасля крана на опуску перад газавымі прыладамі — клопат і адказнасць жыхара.

Газавікі могуць не толькі замяняць абсталяванне, але і правесці яго дыягностыку і прагчынуць тэрмін службы, калі яно ў добрым тэхнічным стане. Аднак запчасткі да абсталявання выпускаюць толькі на працягу дзесяці гадоў.

— У Правілах расшыфраваны тэрмін «спецыялізаваная арганізацыя» і абазначана, якія патрабаванні існуюць да тых, хто займаецца прачысткай дымавых і вентыляцыйных каналаў, — дадаў ён.

Раней тэхабслугоўванне газавага абсталявання праводзілася ў тэрміны, якія вызначаў завод-вытворца і па ведамасных дакументах газазабяспечвальных арганізацый («Белпаліўгаз»). Цяпер у рэгламент тэхабслугоўвання газаправодаў і газавага абсталявання ўнесены дакладныя тэрміны, калі і што трэба правядзіць, падзяліўся начальнік упраўлення:

— Узмоцнены патрабаванні да абавязковасці правядзення тэхабслугоўвання. Згодна з заканадаўствам, газазабяспечвальная арганізацыя можа спыніць падачу газу, калі існуе пагроза жыццю людзей. І ў новай рэдакцыі правіл неправядзенне тэхабслугоўвання прыроўнена да такой пагрозы. Пры адсутнасці актаў на праверку дымавых каналаў газ у спажыўцоў будуць адключаць, без лішніх размоў.

Сачыць за тэрмінам чарговай праверкі ўладальнік газавага абсталявання павінен сам. Аднак газавікі абяцаюць у пяцідзённы тэрмін нагадваць, што падышоў час тэхабслугоўвання. А таксама ўнікаць у сітуацыю, калі чалавек у водпуску ці бальніцы.

Спажывец абавязаны ажыццяўляць тэхабслугоўванне і кантраляваць яго тэрміны (вядома, праводзіць непасрэдна праверку будзе абслуговая арганізацыя. — **«Зв.»**), падкрэсліў **Андрэй ВІРАЧКІН, першы намеснік генеральнага дырэктара Мінгаза**:

— Уводны і ўнутраны газаправоды і газакарыстальнае абсталяванне з адключэннем ад газаразмеркавальнай сістэмы і выпрабаваннем яе на герметычнасць паветрам і адпаведнасць тэхнічнай дакументацыі, даследаванне працаздольнасці газазабяспечвальнага абсталявання правяраюцца не радзей, чым раз на дзесяць гадоў (гэта поўнае тэхнічнае абслугоўванне). Уводны і ўнутраны газаправоды шматкватэрных дамоў з тэрмінам эксплуатацыі больш як 20 гадоў трэба правяраць штогод. Кожны год правяраюцца і газавыя праточныя воданагравальнікі і ацяпляльнае абсталяванне (газавыя катлы). Пры гэтым глядзяць на тэхнічны стан рэгулятара ціску газу. Раз на тры месяцы правяраецца ўводны і ўнутраны газаправоды інтэрнатаў.

За спажыўцамі, дарэчы, захаваўся абавязак мяняць газавае абсталяванне са сконччаным тэрмінам службы. Згодна з новымі правіламі, рабіць гэта могуць (без змены месцазнаходжання абсталявання, яго магутнасці і сістэмы дымавыдалення), як газавікі, так і абслуговая арганізацыя, у якой дагавор са спажыўцом на тэхабслугоўванне ці рамонт, дадаў спецыяліст.

### ДЫМАВЫДАЛЕННЕ І СІГНАЛІЗАТАРЫ

Патрабаванні да сістэм дымавыдалення ў новых правілах таксама ўзмацніліся. Цяпер абанент газу можа самастойна правяраць сваю сістэму толькі тады, калі ён мае кацёл з закрытай камерай спальвання і кааксіяльным выхадам. Усе астатнія дымавыя каналы можа правяраць толькі спецыялізаваная арганізацыя, падкрэсліў Уладзімір Русь.

Сігналізатарамі загазаванасці і выяўлення чаднага газу абавязкова неабходна абсталёўваць памяшканні, дзе зманціравана ацяпляльнае і воданагравальнае абсталяванне, удакладніў **Сяргей КУРАШЭВІЧ, першы намеснік генеральнага дырэктара «Мінскаблгаза»**:

— Абсталяванне манціруецца проста і дазваляе своечасова выявіць уцечку газу або наяўнасць чаднага газу. Дзякуючы гукаваму і светлавому сігналу чалавек зможа своечасова выключыць абсталяванне і звярнуцца ў газазабяспечвальную арганізацыю.

Ён параіў спажыўцам уважліва правяраць, ці сапраўды да іх прыйшоў газавік (у іх ёсць спецыяльная форма і адпаведныя дакументы), каб не быць ашуканымі і не набыць няякасны сігналізатар.

Дымавыя і вентыляцыйныя каналы жылля таксама неабходна правяраць. Пры гэтым існуе першасная і паўторная праверкі іх тэхстану, якія ажыццяўляюцца па заяўным прынцыпе, расказала **Алена АБАБУРКА, вядучы інжынер упраўлення сістэм газазабеспячэння «Белпаліўгаз»**:

— У шматкватэрным жыллі за гэта адказная арганізацыя, а ў аднакватэрных блакіраваных дамах — спажыўцы. Першасная праверка праводзіцца толькі спецыялізаванай арганізацыяй. А вось паўторныя могуць выконваць або спецыялізаваныя арганізацыі, або самі спажыўцы, калі ў іх жыллі вытрыманы пэўныя ўмовы (блакіраваны або аднакватэрны дом, у якім устаноўлена ацяпляльнае і воданагравальнае абсталяванне, якое выкарыстоўвае газ і мае закрытую камеру згарання і кааксіяльны дымаход). Такія ўласнікі могуць прайсці навучанне ў арганізацыях адукацыі і атрымаць пасведчанне аб праве на самастойную праверку дымавых і вентканалаў. Інфармацыю аб праверцы яны будуць адлюстроўваць у адпаведных журналах, якія будуць весці.

Грамадзяне, якія цяпер маюць такія пасведчанні па праверцы каналаў, аднак іх газавае абсталяванне не адпавядае патрабаванням новых правіл (не мае закрытай камеры згарання і кааксіяльнага дымаходу), у сёлетні ацяпляльны сезон яшчэ змогуць здзяйсняць праверку. Аднак налета яны ўжо мусяць звярнуцца для праверкі ў спецыялізаваную арганізацыю. Пра гэта ім дадаткова паведаміць у газазабяспечвальная арганізацыя, засяродзіла ўвагу спецыяліст.

### ДАГАВОР ПАКЕТАМ ЦІ ПААСОБКУ

Формы «газавых» дагавораў таксама значна змяніліся. Новыя дакументы са спажыўцамі газавікі плануюць перазаключыць на працягу найбліжэйшых двух гадоў. Акрамя таго, дагаворы падзялілі па відах у залежнасці ад паслуг: на газазабеспячэнне, а таксама тэхабслугоўванне і рамонт газазабяспечвальнага абсталявання і ўводных ці ўнутраных газаправодаў, паведаміла Алена Абабурка:

— У новай рэдакцыі правіл заключыць дагавор на газазабеспячэнне можна толькі пасля таго, як спажывец заключыць дагавор на тэхабслугоўванне і рамонт абсталявання. Дагавор уступае ў сілу з моманту фактычнага падключэння да газаразмеркавальнай сістэмы, а не з часу падпісання дакумента.

Прадугледжана тыпавая форма дагавора на тэхабслугоўванне ўводнага і ўнутранага газаправодаў пры газазабеспячэнні шматкватэрнага жылля праз газаразмеркавальную сістэму. Ён заключаецца паміж абслуговай арганізацыяй і ўпаўнаважанай асобай па кіраванні агульным домаўладаннем або арганізацыяй, якая эксплуатуе жылфонд, або таварыствам уласнікаў. Такім чынам, існуе тры віды дагавораў, падкрэсліла яна.

— Права не толькі забяспечваць газам, але і абслугоўваць спажыўца маюць у тым ліку і газавікі. А чалавек сам вырашае, з кім яму заключыць дагавор. Абанент можа выбраць сабе арганізацыю для абслугоўвання асобна і газавага лічыльніка, і пліты, і катла. Аднак гэта, пэўна, найгоршы варыянт, — лічыць Уладзімір Русь. — Складанасць у тым, што такіх дагавораў будзе некалькі, аднак спажыўцы, хутчэй, захочуць комплексную паслугу, каб прыйшоў адзін спецыяліст і абслужыў усё абсталяванне згодна з тэрмінамі (газаправод, кацёл, лічыльнік). Калі з'явяцца арганізацыі, якія будуць спецыялізавацца толькі на адным відзе абсталявання (гарантыйным і пасляграантыйным), гэта створыць канкурэнцыю на рынку газавых паслуг і гэта нармальна. Аднак павінен быць нагляд за такімі кампаніямі, бо вопыту ў іх будзе значна менш, чым у газавікоў.

Мінэнерга з часам плануе стварыць пісьмо з тлумачэннямі да правіл, у тым ліку і па патрабаваннях да абслуговых арганізацый.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пуцін падпісаў указы аб прызнанні незалежнасці ДНР і ЛНР



Прэзідэнт Расіі позна вечарам 21 лютага ў прамым тэлеэфіры падпісаў указы аб прызнанні незалежнасці Данецкай народнай рэспублікі і Луганскай народнай рэспублікі, паведаміла БелТА. Таксама Уладзімір Пуцін і кіраўнікі ДНР і ЛНР падпісалі дагаворы аб дружбе і супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе. Перад цырымоніяй падпісання прэзідэнт Расіі ў тэлевізійным звароце да расіян канстатаваў: сітуацыя на Данбасе зноў набыла крытычны і востры характар. Ён падкрэсліў, што Расія зрабіла ўсё для захавання тэрытарыяльнай цэласнасці Украіны, цярпліва і настойліва чакаючы ад яе выканання рэзалюцыі Савета Бяспекі ААН ад 2015 года па мінскім комплексе мер па ўрэгуляванні сітуацыі на Данбасе. Аднак, адзначыў Уладзімір Пуцін, нацыяналістычныя сілы, якія захапілі ўладу ў выніку дзяржаўнага пераварота ў 2014 годзе ўладу ва Украіне, не прызнаюць іншага метаду вырашэння пытання, акрамя ваеннага. Прэзідэнт Расіі запатрабаваў ад кіеўскіх улад неадкладна спыніць баявыя дзеянні на Данбасе. «У адваротным выпадку ўся адказнасць за магчымыя наступствы прадаўжэння кровапраліцця цалкам будуць на сумленні рэжыму, які кіруе на тэрыторыі Украіны», — заявіў ён.

* * *

**Беларусь з павагай і разуменнем успрымае рашэнне расійскага боку аб прызнанні незалежнасці Данецкай і Луганскай народных рэспублік. Пра гэта гаворыцца ў заяве Міністэрства замежных спраў у сувязі з прызнаннем Расіяй незалежнасці ДНР і ЛНР.**

«Беларусь неаднаразова заяўляла аб бяспечнасці безразважных паводзін кіраўніцтва і палітыкаў шэрагу заходніх краін, якія ў апошнія гады ўсё часцей аддаюць перавагу непрыкрытым ціскам і пагрозам у якасці інструментаў вырашэння сваіх і міжнародных праблем. Улік інтарэсаў іншых удзельнікаў працэсу практычна паўсюдна быў заменены імі на аднабаковыя абмежавальныя меры, гібрыдныя ўздзеянне і агрэсіўную рыторыку, — адзначылі ў ведамстве. — Прамым вынікам стаў імклівы рост напружанасці ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне, а таксама дэградацыя сістэмы міжнароднай бяспекі, якая стваралася дзесяцігоддзямі, дыскрэдытацыя і нівеліраванне аўтарытэту такіх найважнейшых крыніц міру і бяспекі, як ААН і АБСЕ, сваіх прамых абавязкаў па іх. Растаптаныя гарантыі Вялікабрытаніі і ЗША адносна Беларусі па Будапешцкім мемарандуме — таму красамоўны прыклад.

У такой сітуацыі мы з павагай і разуменнем успрымаем рашэнне расійскага боку аб прызнанні незалежнасці Данецкай і Луганскай народных рэспублік. Гэты крок Расіі мае не толькі палітычнае, але і сур'ёзнае чалавечае, гуманітарнае вымярэнне, улічваючы колькасць расійскіх грамадзян, якія пражываюць на дадзеных тэрыторыях і адчуваюць пазбаўленне на працягу амаль васьмі гадоў. Беларусам, як нікому іншаму, знаёмыя жахі вайны, а імкненне жыць у міры і згодзе паміж народамі — у нашым генетычным кодзе.

Рэспубліка Беларусь заўсёды актыўна і паслядоўна выступала за мірнае ўрэгуляванне канфлікту на паўднёвым усходзе Украіны. Мы і цяпер лічым дыпламатычныя метады прыярытэтнымі і гатовы ўсяляк садзейнічаць гэтаму працэсу.

Вітаем заявы расійскага боку аб адкрытасці і дыпламатыі ў гэтым кантэксце. Шлях перамоў у нашым разуменні — адзіна аптымальны для таго, каб не дапусціць кровапраліцця паміж брацкімі славянскімі народамі. Заклікаем усе бакі ўстрымацца ад ваеннай эскалацыі і любых іншых дзеянняў, якія закрываюць дарогу да міру.

Нагадваем пра асаблівую адказнасць ЗША і ЕС у нагнятанні абстаноўкі ў нашым рэгіёне. Неабходна перастаць правакаваць гвалт, напампоўваць Украіну і краіны Балтыі войскамі і зброяй, уводзіць незаконныя санкцыі. Беларускі бок у сваіх далейшых дзеяннях мае намер сыходзіць з прынцыпаў добрасумленнага стаўлення ўсіх бакоў да выканання прынятых на сябе міжнародных абавязацельстваў, стратэгічнага саюзніцтва з брацкай Расіяй, а таксама ўлічваць далейшае развіццё сітуацыі».

Ведай нашых!

# ПОСПЕХ — ТАЯ Ж ЛЕСВІЦА:

## трымаючы рукі ў кішэнях, па ёй высока не ўзлезеш

**Не так даўно маёй зямлячцы Таццяне Лаўрэнаўне Ляшчынскай споўнілася 90! Не кожнаму шчасціць столькі пражыць, а тым больш сустрэць гэты юбілей на сваім працоўным месцы, у Нацыянальным інстытуце адукацыі, дзе юбілярка — дацэнт, кандыдат педагагічных навук, прызнаны ў краіне і далёка за межамі спецыяліст у галіне карэкцыйнай педагогікі, аўтар соцень публікацый, вучэбных дапаможнікаў, метадычных матэрыялаў і распрацовак — па-ранейшаму працуе на поўную стаўку.**



Нарадзілася Таццяна Лаўрэнаўна ў вёсцы Сіманавічы Лельчыцкага раёна ў сям'і настаўнікаў, якія пазней перабраліся на Брагіншчыну. Так што сярэднюю адукацыю іх дачка атрымлівала ў самім райцэнтры, у школе № 1, ходзячы — туды і назад каля дзесяці кіламетраў — з вёскі Каваки.

У школе, пасля вайны, як успамінае Таццяна Лаўрэнаўна, не хапала самага неабходнага — падручнікаў, сшыткаў, аднак былі цудоўныя педагогі: настаўніца нямецкай і рускай мовы, літаратуры Аляксандра Кірылаўна Кулініч (дарэчы, выпускніца аднаго з дарэвалюцыйных інстытутаў высакародных дзяўчат і ўладальніца самай багатай у раёне прыватнай бібліятэкі), выкладчыца батанікі і біялогіі Аляксандра Якаўлеўна Джэжора, урокі якой базаваліся на шматвяковым вопыце мясцовых садаводаў-агароднікаў, сам дырэктар школы — франтавік, кавалер ордэна Чырвонай Зоркі Сцяпан Аляксеевіч Нікіцін...

З усмешкай Таццяна Лаўрэнаўна ўспамінае, як менавіта ад яго ў восьмым класе атрымала заданне падрыхтаваць рэферат пра «Маніфест камуністычнай партыі». Ноч пасля гэтага не спала, — думала, што да чаго, а зранку з пытаннямі падышла да бацькі. Той і падказаў, што рэферат — гэта нешта накшталт даклада, а вось пра маніфест яна даведаецца сама, калі яго прачытае.

Давялося засесці за кнігу, уразіцца тым, што здань камунізму блукае па Еўропе, а значыць, яе, тую здань (эўрыка!) можна ўбачыць і тут, у іх вёсцы Кавака...

Для гэтага юная паляшучка надвячоркам падалася на... могілкі. Здань камунізму, на шчасце ці на жаль, там не сустрэла, але набыла, так бы мовіць, свой першы навукова-даследчы вопыт, праявіла вострае жаданне да ўсяго дакапацца самой, на выдатна выканала заданне дырэктара.

...Сярэднюю школу Таццяна Ляшчынская скончыла з залатым медалём і адразу паехала «заваёўваць Маскву». Сумоўе на журфаку ў знакамітым універсітэце імя Ламаносава прайшло добра. Дрэнным па тым часе аказалася тое, што «пражывала на акупаванай тэрыторыі». Гэта дзяўчыну і падвяло. А далей...

Ні родных, ні знаёмых у Маскве не было, грошай — як кот наплакаў. Студэнтам педінстытута, куды магла паступіць, давалі інтэрнат. Гэта і абумовіла выбар.

Таццяна Лаўрэнаўна да сёння з удзячнасцю ўспамінае сваіх школьных настаўнікаў, бо ўзровень ведаў, якія яна атрымала, дазваляў даволі спакойна пачувацца нават сярод студэнтаў-масквічоў.

Адзінае, што далося ёй цяжка, — расставанне з роднай беларускай мовай. Прыкладам, на семінары па матэматыцы яна даводзіла, што калі «а» большае за «б», а «б» большае за «с», то тады...

Выкладчык, падобна, не вельмі разумеў складаныя для ягонага вуха лінгвістычныя канструкцыі, але будучы мяккім маскоўскім інтэлігентам, выказаў сваё здзіўленне так: *«Разрешите поинтересоваться, почему вы говорите «больше **за**»? Нельзя ли говорить просто «больше», без «**за**»?»...*

І ў метро, падганяючы сябровак, яна таксама крычала сваё «Хутчэй!» — слова, якое потым падхапіла ўся студэнцкая група.

Не дзіва, што, любоў да матчынай мовы Таццяна Лаўрэнаўна пранесла праз усё жыццё: нікалі не саромелася размаўляць па-беларуску, свабодна карысталася мовай у навуковай і педагагічнай дзейнасці.

Агульны працоўны стаж юбіляркі больш за 70 гадоў! У ліку яе ўзнагарод — тры знакі «Выдатнік адукацыі» — СССР, БССР і Рэспублікі Беларусь, медаль ГДР (была ў біяграфіі і праца ў нямецкім Магдэбургу), ганаровыя граматы, падзякі... І ў аснове гэтага жыццёвага поспеху Таццяны Лаўрэнаўны, яе аднакласнікаў ды іншых палешукоў — іх прыродная асабістая руплівасць, дапытлівасць розуму і вялікая працаздольнасць. Як казаў нехта з вялікіх, поспех — гэта тая ж лесвіца: трымаючы рукі ў кішэнях, па ёй высока не ўзлезеш.

**Валерый Герасімаў,**
**выпускнік Брагінскай СШ № 1,**
*г. Мінск.*

Рэзананс

# «КАХАННЕ — ГЭТА ЗУСІМ НЕ СЛОВЫ...»

**Хочацца падзякаваць газеце за артыкул «Герой» чужога рамана» («Звязда» ад 16 лютага 2022 г.). Думаю, многія з жанчын, асабліва маладых, прачытаўшы яго, падумалі: «Во, і са мной такое было...» Многія маглі б пра гэта расказаць і, можа, нават хацелі б, але...**
**Нехта не адважыцца, нехта адкладзе на потым. А ў выніку на тыя ж самыя граблі (чужыя «падкаты-кампліменты» ды прыгожыя словы) будуць наступаць іншыя і тым самым...**

Раскажу пра сябе. Я вучылася ў дзясятым класе, калі ў нашу вёску прыехаў малады спецыяліст, выпускнік політэхнічнага інстытута. Ён, як расказваў, з першага позірку закахаўся ў мяне, зрабіў прапанову. Я, не паступіўшы ў інстытут, проста не ведала, што рабіць і... пайшла замуж. Калгас выдзеліў нам палову двухкватэрнага дома. Мы распачалі там вялікі рамонт і будаўніцтва хлява (свякроў абяцала карову), я зацяжарыла... Іншымі словамі праз пяць гадоў у нас з Паўлам было ўсё: двое малых, дом, гаспадарка, гараж, іншамарка хай і не новая... На ёй мы ўсе разам ездзілі да бацькоў мужа (мае жылі непадалёк), ладзілі вылазкі на рыбалку, у грыбы, у сталіцу... Дзеці раслі здаровымі. Я пайшла працаваць...

Жыццё азмрочвала толькі гарэлка. Наш гаспадар з гадамі ўсё часцей і часцей стаў прыкладацца да чаркі, прычым іншым разам «браў на грудзі» столькі, што прыйсці дадому ўжо не мог — яго прыносілі альбо цвеnecesa... 

Якраз у гэтыя часы і ўзнік на гарызонце іншы мужчына — нашмат старэйшы за мяне, адукаваны, і галоўнае, заўсёды цвярозы і гэткі шчодры на словы... Ад мужа за ўсё сумеснае жыццё я столькі кампліментаў не чула!

Не дзіва, што закружылася галава, што захацелася вярнуцца ў маладосць, пабегаць па спатканні, і я, дурніца, жывучы недзе ў горадзе, можа, і пабегла б, але ў вёсцы... Тут жа ў хаце чхнуць не паспееш, з вуліцы «будзь здароў» даляціць!

Карацей, нічога ў нас з тым кавалерам не выйшла, а за дрэнныя памкненні ці не бог мяне пакараў — на хуткай завезлі ў бальніцу.

Думала, здурнею там ад думак: ці выжыву і ці будзе куды вярнуцца? Дзеці паступілі вучыцца, муж, напіўшыся, мог закурыць і...

Дарэмна я баялася. Паўла майго — як падмянілі. Ён (цвярозы) пастаянна званіў і амаль штодня прыязджаў, прывозіў усё, што скажу, і нават болей. Па інтэрнэту навучыўся варыць морс і кісель, розныя булёны, пячы мае любімыя аладкі...

А далей болей: прыехаўшы з бальніцы дамоў, я ўбачыла там проста ўзорны парадак і зразумела, што каханне — гэта зусім не словы і не кветкі з пацалункамі. Каханне — гэта ўчынкі: памытая падлога, дагледжаная гаспадарка, прапалотыя грады...

Каханне — гэта адмова ад «сяброў» і гарэлкі, гэта жаданне разам сустракаць дзяцей і, калі пашанцуе, гадаваць унукаў.

**Алена М.,**
*Мінскі раён.*

На здароўе!

# БУДЗЕ ХЛЕБ ХАРОШЫ...

## І без лішніх грошай

**Многія вялікія крамы прапануюць цяпер сваю выпечку. Ім, трэба разумець, гэта выгадна, а вось ці выгадна пакупнікам, яшчэ варта падумаць.**

Кажу так, бо неяк пры мне адчыніліся дзверцы той хлебапякарнай шафы, і адтуль шуганула гэтакім дымам... Да бабкі не хадзі: падгарэла выпечка. У такой, на думку навукоўцаў, утрымліваюцца акрыламіды, якія правакуюць самыя розныя хваробы. Яшчэ адзін мінус пакупнога хлеба — выкарыстанне дражджэй.

Па гэтых ды іншых прычынах хлеб з крамы на нашым стале з'яўляецца вельмі рэдка. Яго мы варым самі і амаль штодня. Пытанне, з чаго? У муцэ вышэйшага гатунку ў два-тры разы менш карысных рэчываў (вітамінаў, ферментаў, мінералаў). Значыць, выбар варта спыніць на муцэ першага гатунку. На пакетах з ёй пазначаны маркі. Напрыклад, М 36-30, М 36-27, М 54-25. Першая лічба паказвае ступень ачысткі мукі, другая — колькасць клейкавіны (раслінная бялку). Адкуль відавочна: больш карыснай для здароўя будзе мука, дзе першая лічба ніжэйшая, а другая — вышэйшая.

Ёсць у продажы і зерневыя жытняя і пшанічная мука. Яны самыя карысныя (праўда, не для тых, хто мае захворванні страўніка)...

А зараз рэцэпт хлеба, які ў нашым родзе перадаецца з пакалення ў пакаленне.

У паўлітровы слоік разбіваем адно яйка (можна і без яго), уліваем шклянку (250 грамаў) вады, на працягу хвіліны разбоўтваем пад накрыўкай. Потым, перамешваючы лыжкай, пакрысе, дадаём муку (1-2 сталовыя лыжкі зерневай і жытняй, 5-6 сталовых лыжак першага гатунку (можна толькі яе). У выніку атрымаецца поўны слоік цеста гушчынёй смятаны.

У гэты час на пліце ў каструлі (лепей шырокай) ужо кіпіць літр вады. У яе выліваем цеста і адразу ж драўлянай лапаткай падымаем яго са дна, каб не прыгарэла. А далей бачым, як на паверхні з'яўляюцца аладкі (у першы раз можа атрымацца і нешта накшталт куляша... Значыць, цеста трэба рабіць гусцейшае) — розныя формы і велічыні...

Варыць іх, пастаянна памешваючы, трэба каля сямі хвілін. Есці — з чым заўгодна: з малаком, варэннем, мясам, вяршкамі...

Пераваг у гэтага хлеба шмат. Ён, папершае, без дражджэй, без акрыламіду, гатуецца хутка, з захоўваннем усіх карысных рэчываў. Да таго ж у свойскім хлебе няма ніякіх дадаткаў і ён у разы таннейшы за крамны...

Але самае галоўнае — ужыванне такога хлеба дазваляе палепшыць работу страўніка і кішэчніка, падстраўнікавай залозы...

Іншымі словамі, перавагі відавочныя. Так што паспрабаваць варта.

**Аляксандр Васільеў,**
*г. Віцебск.*

Весткі з месцаў

# НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА...

**У нашым дзіцячым садку «Алёнка» ёсць добрая традыцыя: у дзень роднай мовы ладзіць конкурс чытальнікаў «Зорны напеў».**



Удзел у ім прымаюць і дзеці, і дарослыя. Прыбраўшыся ў нацыянальныя строі, яны чытаюць вершы беларускіх паэтаў пра тое, што ім падабаецца: прыроду, горад, любімых жывёл... А яшчэ на працягу дня выхаванцы слухаюць казкі на роднай мове, спяваюць песні, гуляюць у народныя гульні — змалку далучаюцца да спадчыны свайго народа.

**Вольга Змітраковіч,**
**выхавальніца,**
*г. Крупкі.*

Смех смехам

# НЕ СУПАЛА...

**Напрадвесні дзед Раман выпаўз на сонейка, сеў на лаўку, прытуліў да нагі кіёк ды стаў назіраць за суседам. Той з самай раніцы корпаўся ў машыне, а ўрэшце пагладзіў рукамі па брудных портках, падсеў да старога ды, зацягнуўшыся дымам, спытаў, як жа так атрымалася, што дзед (і не зломак як быццам) застаўся бабылём, — не жаніўся? Быць, маўляў, не можа, каб дзевак ды баб не было, каб не любіў ніводнай?!**

— Былі, браток! — успомніў стары. — І любіў, але... Сарамлівасць згубіла.

— Як? Ты не ведаў, што з ёй рабіць? — здзівіўся маладзён. — Чарку-другую для храбрасці і наперад!

— Ды спрабаваў, — прызнаўся дзед. — І дарэмна: пакуль цвярозы, я дзяўчат баяўся, калі вып'ю, — яны мяне... Так сваю і прамаргаў. Думаў, жыццё яшчэ доўгае — паспею. А яно, брат, куляй і міма... Глядзі, каб сам да таго ж не дажыўся.

Урок.

**Галіна Нічыпаровіч,**
*Уздзенскі раён.*

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# НЕПРАДКАЗАЛЬНЫЯ НАСТУПСТВЫ

## Якія змены на скуры могуць указваць на заражэнне COVID-19 і чаму пасля хваробы выпадаюць валасы?

**Медыцыне вядома пра самыя розныя наступствы COVID-19. Гэта інфекцыя можа выклікаць ускладненні сардэчна-сасудзістых паталогій, хвароб нырак, нервовай, эндакрыннай сістэм. Сёння мы пагаворым пра скурныя праявы самой каранавіруснай інфекцыі і ў прыватнасці пра такое распаўсюджанае наступства, як выпадзенне валасоў. Разабрацца ў гэтым нам дапамагла Вікторыя ВЯЛЮГІНА, урач агульнай практыкі 11-й сталічнай паліклінікі.**



### Паражэнне сасудаў і сып

Сёння вядома як мінімум аб васьмі групах паражэнняў скуры пры каранавіруснай інфекцыі. Першая — гэта ангііты, або паражэнне эндатэлію сасудаў.

— Пры каранавіруснай інфекцыі паражэнне сасудаў з'яўляецца адным з ключавых і важных механізмаў паталагічнага працэсу, адсюль трамбозы і іншыя сасудзістыя паталогіі, — кажа Вікторыя Валер'еўна.

Другая група — гэта адзёрападобны сып. Ён пачынаецца гэтак жа, як і адзёр, зверху ўніз і ў цэлым вельмі падобны на яго па праявах. Гэта своеасаблівая зваротная рэакцыя скуры на наяўнасць інфекцыйнага агента ў арганізме.

Па такім жа прынцыпе, а менавіта як інфекцыйна-алергічная рэакцыя, развіваецца і трэцяя група скурных параз — ружовы лішай. Гэтае сезоннае захворванне знешне выглядае як бляшкі на скуры, якія лушчацца.

— Яно ўзнікае адзін раз у жыцці, якраз на фоне ВРВІ. А COVID-19 блізкі да вострай рэспіраторнай віруснай інфекцыі, — тлумачыць урач. — І тут сітуацыя ў розных пацыентаў адрозніваецца. У адных быў дыягнаставаны класічны ружовы лішай. У іншых — проста падобнае высыпанне, але з незвычайнымі праявамі. Напрыклад, не было матчынай бляшкі (першае адзіночнае высыпанне) ці ж яна, наадварот, была занадта вялікая. Усе гэтыя праявы адназначна звязаныя менавіта з каранавірусам.

### Патніца, пралежні і ковідныя пальцы

Чацвёртая группа — гэта папула-везікулезныя высыпанні. Гэта значыць, яны мокнуць і маюць бурбалкі. Па вялікім рахунку гэта тое, што ў народзе завуць патніца.

— Яна ўзнікае ў хворых, якія тэмператураць, моцна пацеюць, ляжаць у вільготным ложку. І гэта не звязана непасрэдна з самім вірусам, а больш з сімптомамі, якія суправаджаюць захворванне. Так бы мовіць, другасныя праявы, не звязаныя з прыродай патагенна, — кажа Вікторыя Вялюгіна.

Пятая і шостая групы — гэта крапіўніца і токсікадэрмія. Токсікадэрмія — індывідуальная непераноснасць лекавых прэпаратаў, якая дае рэакцыю на скуру.

— Яна можа ўзнікнуць на антыбіётык, супрацьвірусны прэпарат і іншыя лекі. Крапіўніца ж мае дваякі характар. Можа быць як праявай непераноснасці лекавых прэпаратаў, так і праявай самога каранавіруса, — удакладняе доктар.

Яшчэ адна, сёмая група — артыфіцыяльныя паразы, гэта значыць, выкліканыя знешнімі фактарамі. Працэсей кажучы, гэта пролежні, якія ўзнікаюць у цяжкіх ляжачых хворых на ШВЛ. Цікава, што ў перыяд пандэміі паўстаў яшчэ адзін від такіх паражэнняў, спецыфічны для медработнікаў, — сляды ад рэспіратараў.

Часта аб заражэнні COVID-19 сведчаць выключна скурныя праявы. Напрыклад, крапіўніца і ковідныя пальцы або ілжывыя абмаражэнні.

— Гэта два віды паражэння скуры, якія могуць узнікаць, калі пацыента практычна нічога не турбуе. Цяпер, калі чалавек звяртаецца да дэрматолага з такімі праявамі, урач можа па адным гэтым сімптоме западозрыць каранавірус і накіраваць на дадатковае абследаванне, — адзначае Вікторыя Вялюгіна.

Ковідныя пальцы, дарэчы, — адна з самых ранніх прыкмет COVID-19. Узнікае яна часцей у маладых з лёгкай формай каранавіруса.

— Гэта пачырваненне кончыкаў пальцаў, іх патаўшчэнне, лёгкае запаленне, бывае, хваравітасць. А на самай справе гэта ішэмія — недахоп харчавання тых ці іншых тканак кравяноснымі сасудамі. Сімптом сустракаецца, паводле апошніх звестак, у 18 % пацыентаў з лёгкай формай, — тлумачыць урач.

### Як спыніць выпадзенне валасоў?

Яшчэ адна група скурных праяў — гэта постковідная алапецыя, прасцей кажучы, выпадзенне валасоў. Такое ўскладненне — адно з самых распаўсюджаных пасля хваробы. Постковіднае аблысенне сустракаецца прыкладна ў 40 % людзей, якія перахварэлі на каранавірусную інфекцыю. Яно ўзнікае ў сярэднім праз сем-восем, часам 12 тыдняў пасля выздараўлення.

— Пацыент (часцей гэта жанчыны, бо яны больш уважлівыя да ўсяго, што датычыцца знешнасці) ужо выйшаў на работу і раптам звяртае ўвагу, што валасы пачынаюць выпадаць. Прычым вельмі актыўна. Адна з гіпотэз такога стану ў тым, што вельмі высокая тэмпература і ўзровень інтаксікацыі адмоўна ўплываюць на валасы. У гэты момант яны перастаюць нармальна сілкавацца і расці, — адзначае доктар. — Але ў выніку валасы выпадаюць не адразу, а праз нейкі час, бо яны яшчэ працягваюць натуральным чынам знаходзіцца ў фалікуле.

Таксама гэта можа быць звязана з тым, што пацыентам з каранавіруснай інфекцыяй прызначаюць антыцытакінавыя прэпараты (цытакіны — гэта прызапаленчыя бялкі, якія выклікаюць запаленчую рэакцыю). Дык вось, самі цытакіны могуць аказваць негатыўнае ўздзеянне на валасяны фалікул, выклікаючы запаленне вакол яго і парушаючы сілкаванне. Ну і трэцяя гіпотэза — той самы ангііт. Волас сілкуецца сасудам, а ў ім могуць быць змены з прычыны хваробы: ён можа запаляцца ці трамбавацца. Адпаведна, сілкаванне зноў жа пагаршаецца, і волас выпадае.

Сродкі лячэння тыя ж самыя, як і пры звычайным выпадзенні валасоў. Ёсць методыкі, вельмі запатрабаваныя і папулярныя. Існуюць прэпараты, якія ўжо даўно на рынку, паляпшаюць харчаванне валасянога фалікула за кошт лакальнага пашырэння сасудаў. Напрыклад, мінаксідыл. Яшчэ ёсць прэпараты, якія змяшчаюць фактары росту валасянога фалікула. І трэцяе — тое, што зараз папулярна і модна, — плазматэрапія. Выкарыстоўваюць плазму крыві пацыента. Яна праганяецца праз цэнтрыфугу, там узбагачаецца трамбацытамі, якія самі па сабе фактары росту, і гэтым растворам праводзіцца абколванне.

— Любое абколванне (нават фізрастворам) — усё роўна пракол у скуру і міні-стрэс для гэтай зоны, здольны крыху яе ажывіць. Такі метад раней называўся мезатэрапіяй. Калі ж выкарыстоўваецца ўласная плазма крыві пацыента, гэта ўжо плазматэрапія, — тлумачыць доктар.

А вы ведалі?

# ВІНАВАТЫ ГАДЖЭТЫ?

## Як сучасныя прылады пагаршаюць наш зрок

**Такія фразы, як «не жмурся», «еш больш морквы і чарніц», «не сядзі блізка каля тэлевізара», напэўна, чуў або казаў кожны з нас. Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, ва ўсім свеце каля 2,2 мільярда чалавек пакутуюць на парушэнне зроку. Амаль у паловы з іх яго можна было прадухіліць ці яшчэ можна скарэктаваць.**

### Блізарукасць — прыкмета сучаснасці

— Асноўныя прычыны парушэння зроку — нескарэктаваныя анамаліі рэфракцыі (блізарукасць, дальназоркасць, астыгматызм, прэсбіяпія) і катаракта. Самым распаўсюджаным парушэннем рэфракцыі з'яўляецца блізарукасць, — кажа **ўрач-эпідэміёлаг, загадчыца арганізацыйнага аддзела Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Людміла ЦІТАВЕЦ.** — Блізарукасць, або міяпія — гэта факусіроўка выявы наперадзе сятчаткі. Абумоўлена такая з'ява або празмернай праламляльнай сілай аптычнай сістэмы вока, або падаўжэннем пярэднязадняй восі вочнага яблыка.

Адным з фактараў, якія ўплываюць на развіццё блізарукасці, з'яўляецца перанапружанне вачэй. А ў сучасным свеце без гэтага ніяк: мабільныя прылады цяпер на ўсіх сферах нашага жыцця. Даступнасць смартфонаў, планшэтаў, электронных чы-



талак, разумных гадзіннікаў спрыяе іх масаваму распаўсюджванню.

### Як прадухіліць пагаршэнне зроку?

Прадухіліць перанапружанне вачэй пры выкарыстанні электронных прылад можна, калі ўлічваць наступныя складнікі.

**Памер экрана.** Чым меншы экран, тым больш даводзіцца напружваць вочы, нагружаючы акамадацыйны апарат.

**Адлегласць ад вачэй да экрана.** Адна з галоўных асаблівасцяў выкарыстання гаджэтаў заключаецца ў тым, што іх экраны размешчаны на занадта блізкай адлегласці ад вачэй. Пры гэтым пастаяннае напружанне акамадацыйных мышцаў, якія дазваляюць выразна бачыць прадметы зблізку, з часам можа прыводзіць да іх спазму. А гэта той стан, калі яны «заміраюць» у адным становішчы, не дазваляючы выразна разглядзець прадметы на іншых адлегласцях.

**Сіняе выпраменьвальнае святло экрана.** Доўгае ўздзеянне сіняга святла прыводзіць да стамлення вачэй. Гэта можа праяўляцца ў выглядзе сухасці, рэзі ці адчування пяску ў вачах, што пры рэгулярным паўторы можа прывесці да пагаршэння вастрыні зроку. Таксама не рэкамендуецца карыстацца гаджэтамі перад сном, бо іх спецыфічнае святло ўскладняе засынанне і замінае глыбокаму сну. Зрэшты, каб паменшыць нагрузку на зрок, у шматлікіх сучасных прыладах прадугледжаны адмысловы «начны» рэжым экрана.

